СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 6.33, 18.07, 11.34;
Віцебск — 6.23, 17.56, 11.33;
Магілёў — 6.22, 17.56, 11.34;
Гомель — 6.16, 17.56, 11.40;
Гродна — 6.45, 18.24, 11.39;
Брэст — 6.48, 18.24, 11.36.

МЕСЯЦ:
Першая квадра 12 сакавіка.

ІМЯНІНЫ:
Васіля, Мікалая, Нестара, Марыны, Кіры; Бярнарда, Рыгора.

ЗВЯЗДА

12 САКАВІКА 1992 г.
чацвер, № 52 (21830)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 50 кап.

ПОДЫХ КРЫЗІСУ АДЧУВАЕЦЦА НАВАТ У СЦЕНАХ ПАРЛАМЕНТА

З раніцы плошча Незалежнасці перад Домам урада, дзе пачалася чарговая сесія Вярхоўнага Савета, выглядала непрывычна пустой. Некалькі пікетаў народафронтаўцаў збіралі подпісы ў падтрымку рэферэндуму, — больш актыўнасці не назіралася. Праўда, бліжэй да паўдня сюды пачалі збірацца настаўнікі — прычым не толькі са школ Мінска. «Педагогі сталі жабракамі» — вось у некалькіх словах змест іх скаргаў. Адпаведна галоўнае патрабаванне — павышэнне зарплаты.

Цяжка сказаць, якая сацыяльная група не мае сёння падстаў выйсці на плошчу з такімі ж скаргамі і нараканнямі. Прыкра, але спадзявацца ў бліжэйшыя месяцы нам няма на што: жыццёвы ўзровень хутчэй за ўсё будзе зніжацца. Калі меркаваць па выступленню на сесіі Старшыні Савета Міністраў В. Кебіча (яго даклад значыўся ў парадку дня першым), у выніку магчымага блізкага павышэння цэн на энерганосьбіты нам давядзецца плаціць за прадукты харчавання, паводле самых сціплых падлікаў, у 3—5 разоў больш, чым цяпер. Адпаведна вырастуць цэны і на прамысловыя тавары. А бюджэт тым часам трашчыць па швах: нацыянальны даход за два месяцы знізіўся на 15 працэнтаў. Па кім найбольш балюча ўдарыць жорсткі эканамічны крызіс — гадаць не прыходзіцца, — па тых, чые даходы напрамую залежаць ад магчымасцей дзяржаўнага бюджэту.

Урад разумее, у якой складанай сітуацыі апынуўся. Крыніц папаўнення дзяржаўнай кішэні не так ужо многа. Таму лагічнай выглядае пазіцыя В. Кебіча адносна новай сістэмы падаткаў, якую так крытыкавалі з усіх бакоў у апошні час. Прэм'ер-міністр заявіў, што не бачыць у ёй прынцыповых хібаў і што ў бліжэйшы час кантроль за выплатай падаткаў будзе ўзмоцнены. Сваё меркаванне Вячаслаў Францавіч падмацаваў рэкамендацыямі незалежных экспертаў з Міжнароднага валютнага фонду, якія на працягу некалькіх тыдняў вывучалі падатковую сістэму ў Беларусі і прыйшлі да высновы, што яе калі і трэба ўдасканальваць, то ў бок яшчэ большай жорсткасці.

Такім чынам, адно са спадзяванняў прадпрымальнікаў — што ўрад пад іх націскам пойдзе на перагляд сістэмы падаткаў — не збылося. Праўда, В. Кебіч паабяцаў некаторыя паслабленні малым і сярэднім прадпрыемствам, а таксама прадпрыемствам творчых саюзаў, але гэтыя льготы наўрад ці развяжуць бізнесменам рукі ў такой ступені, як ім хацелася б.

— Груз падаткаў цяжкі. Але ў пераходны перыяд гэты груз вымушаны несці ўсе мы. І не час уносіць у новую сістэму якія-небудзь прынцыповыя змены, — падсумаваў свае аргументы прэм'ер-міністр.

Напружаная эканамічная і палітычная сітуацыя ў рэспубліцы, відавочна, паўплывала на настрой дэпутатаў. Пры абмеркаванні парадку дня было намнога менш, чым звычайна, зацяжных бясплённых дыскусій.

Больш як пяцьдзесят пытанняў давядзецца абмеркаваць на гэтай сесіі дэпутатам. Пераважная большасць іх датычыць эканамічных і вайсковых праблем. У шэрагу найбольш прынцыповых — законапраекты аб раздзяржаўленні і прыватызацыі, аб процідзеянні манапалістам, аб уласнасці на зямлю, аб абароне, аб статусе ваеннаслужачых і іх сем'яў.

Магчыма, ужо на гэтай сесіі адбудуцца прынцыповыя змены ў структуры Вярхоўнага Савета: адпаведнае пытанне значыцца адным з першых у парадку дня. Калі гэтыя змены стануць рэальнасцю, правядзенне рэферэндуму, відавочна, стане праблематычным.

На дзіва прыхільна паставілася большасць дэпутатаў да дапаўненняў у парадак дня, прапанаваных апазіцыяй БНФ. Абедзве прапановы — законапраект аб барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, карупцыяй і наркабізнесам, а таксама стварэнне часовай дэпутацкай камісіі па факту прыватызацыі Белдзяржстраха — былі без доўгіх спрэчак ухвалены парламентам.

А вось з прапановай Старшыні Вярхоўнага Савета разгледзець Закон аб выбарах старшынь мясцовых Саветаў сталася іначай. Большасць дэпутатаў палічыла, што выбаршчыкі яшчэ не дараслі да такой ступені дэмакратыі, каб самім выбіраць кіраўнікоў мясцовых органаў улады.

Яшчэ адно прынцыповае дапаўненне да парадку дня сесіі было ўнесена толькі што створаным аб'яднаннем дэпутатаў «Беларусь»: неадкладна разгледзець пытанне аб вайскоўцах з Беларусі, якія служаць за яе межамі. Парадаксальна, але факт: пасля многіх адназначных рашэнняў, прынятых наконт гэтага і парламентам, і ўрадам, нашы хлопцы працягваюць несці службу далёка ад Радзімы, і, у прыватнасці, у Закаўказзі.

Чарговы парламенцкі марафон пачаўся. Прадоўжыцца ён, па самых сціплых прыкідках, да сярэдзіны красавіка. Зрэшты, да таго часу, магчыма, парламент ужо стане пастаянна дзеючым.

Валянцін ЖДАНКО.

Працуе дзевятая сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ і Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Выступленне С. С. ШУШКЕВІЧА

пры адкрыцці сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Шаноўныя народныя дэпутаты, шаноўныя запрошаныя! Пачынаем работу дзевятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання. Сітуацыю ў рэспубліцы вы добра ведаеце, яна набліжаецца да крытычнай. Спадае вытворчасць, паніжаецца ўзровень жыцця, разбуральныя тэндэнцыі прэвалююць над стваральнымі. Людзі незадаволены дзеяннямі ўлады, усе крокі па рэфармаванню эканомікі не далі пакуль станоўчых вынікаў. Цэны растуць, у дзяржаўным гандлі сітуацыя дрэнна кантралюецца, людзі абураюцца самаўпраўствам, вялікімі нацэнкамі.

Як тут апраўдаць дзеянні велізарнага корпусу работнікаў сістэмы кіравання? Асабліва абураюцца людзі малой эфектыўнасцю, ды і проста бяздзейнасцю выканаўчых улад на месцах. Мясцовыя ўлады часам дэманструюць поўную няздольнасць да гаспадарчага кіравання, няма надзейных механізмаў кантролю, выканання рашэнняў вышэйшай улады.

Чыноўнікі розных рангаў, а што яшчэ больш абурае, народныя дэпутаты ўсіх узроўняў зневажаюць закон, злоўжываюць службовым становішчам. Аб гэтым сведчаць не толькі сродкі масавай інфармацыі, не толькі лісты і заявы ў Вярхоўны Савет, не толькі грамадзяне на прыёмах, але і афіцыяльныя прадстаўленні Пракуратуры Рэспублікі Беларусь. Чаму так адбываецца?

Перамены ў многім блакіруюцца былой наменклатурай, здольнай толькі выконваць загады, ды і то ад пачуцця страху. І калі раней у раёне былі дзве сілы (сакратар райкома партыі, старшыня райвыканкома), і тым самым быў пэўны ўзаемакантроль, то зараз усё ў адных руках. Застаецца толькі спадзявацца на высокую маральнасць кіраўніка. Але яна, на жаль, не вельмі шырока распаўсюджана.

Шмат што змяніў бы Закон аб выбарах старшынь мясцовых Саветаў. На жаль, такі закон мы пакуль што з вамі не прынялі. Я прапаную вярнуцца да гэтага пытання на гэтай сесіі і выкарыстаць тую распрацоўку камісіі Леўчыка Уладзіміра Канстанцінавіча: даць тым самым грамадзянам рэспублікі магчымасць дэмакратычнага абрання кіраўнікоў мясцовай улады.

Шаноўныя дэпутаты! Нягледзячы на тое, што год назад мы прынялі Зямельны кодэкс, пытанне аб зямлі застаецца нявырашаным у інтарэсах дзяржавы і грамадзян. Шмат дзе вядзецца натуральны сабатаж зямельнай рэформы. Робіцца гэта пад прыкрыццём дэмагагічных заяў, маўляў, разбураецца і нішчыцца калгасна-саўгасны лад. Наконт гэтага афіцыяльна выказаўся Савет аграрнікаў і калгасаў Мінскай вобласці. Падобныя абвінавачанні не маюць пад сабой ніякіх падстаў і накіраваны на захаванне старых, бесперспектыўных падыходаў, чыста адміністрацыйных метадаў.

Трэба грунтавацца не на эмоцыях. Вярхоўны Савет прыняў закон, які прызнае прыватную ўласнасць на зямлю. Неабходна напоўніць гэты закон рэальным зместам, даць аднолькавую магчымасць развівацца ўсім формам уласнасці на вёсцы. Аб разбурэнні калектыўнай гаспадаркі гаворка не ідзе, хопіць гаварыць аб пагрозе калгасам. Да гэтага часу ні адзін калгас не распаўся, ні адзін калгас не ліквідаваны.

Некаторыя лічбы. Сёння, яшчэ дадаткова, больш за 600 чалавек выказваюць жаданне стаць фермерамі (183 з іх гараджане). У мясцовых Саветах ляжыць звыш 380 тысяч заяў на пашырэнне прысядзібных надзелаў калгаснікаў і рабочых саўгасаў, на выдзяленне ўчасткаў у садовых таварыствах і на іх пашырэнне. Людзі пабойваюцца, і не без падстаў, цяжкасцей, імкнуцца забяспечыць сябе і свае сем'і бульбай, агароднінай, садавінай. Наш абавязак падтрымаць і гэтых людзей. Добра, што гаспадарскі падыход захаваўся яшчэ ў большасці беларусаў. Сёння, каб задаволіць усе гэтыя заяўкі, патрабуецца каля 10 тысяч гектараў ворнай зямлі. Гэта нямала. Але ворнай зямлі ў рэспубліцы каля 9 мільёнаў гектараў, і трэба знайсці рашэнне, каб людзі ўжо гэтай вясной атрымалі зямлю і засеялі яе.

Паважаныя народныя дэпутаты! Належнага вырашэння патрабуе і пытанне аб прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці. Людзі абураны і заклапочаны тым, як праводзіцца прыватызацыя ў рэспубліцы. Яны маюць рацыю. Стартавыя магчымасці, на жаль, не ва ўсіх роўныя. Працоўны чалавек па сутнасці застаецца збоку ў той час, як за яго плячыма нехта грэе рукі. Мне непрыемна гаварыць аб гэтым, але не лепшым чынам тут выглядаюць і некаторыя народныя абраннікі. Я думаю, што парламент, у большай ступені, чым хто іншы, нясе адказнасць за «ціхую» прыватызацыю. Закона аб прыватызацыі няма, а прыватызацыя ўжо вядзецца. Мы не паспяваем за ходам падзей. Так, мы спазняемся, але ў любым выпадку справядлівасць трэба аднавіць. Усё, што зроблена супраць закона за гэты час, павінна быць пастаўлена на сваё месца. Кожны грамадзянін рэспублікі мае права патрабаваць аднолькавую магчымасць на старце прыватызацыі.

Шаноўныя дэпутаты! Мы з'яўляемся сведкамі таго, што сённяшнюю нарастаючую нестабільнасць хочуць выкарыстаць у сваіх інтарэсах пэўныя дзеячы і рухі. Яны спрабуюць пераканаць грамадства, што ў распадзе эканомікі, падзенні жыццёвага ўзроўню, іншых бедах вінаваты менавіта Вярхоўны Савет, і што дастаткова распусціць цяперашні парламент, абраць новы, і справы пойдуць на лад. Для гэтага выкарыстоўваецца і той бясспрэчны факт, што работу Вярхоўнага Савета і яго структур сапраўды нельга лічыць ідэальнай.

Але ж наш парламент ідзе непраторанымі шляхамі, па калдобінах ды выбоінах, а таму, натуральна, не застрахаваны ад памылак. Іх можна асэнсаваць, выправіць, калі ёсць галоўнае — адказнасць, а я перакананы, яна ёсць. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пацвердзіў, што ён здольны на асэнсаваныя, збалансаваныя рашэнні, здольны рабіць і, я перакананы, зробіць усё неабходнае для рэфармавання эканомікі, форм уласнасці, механізма кіравання. Таму ў такіх абставінах рэферэндум з мэтай разгону існуючых структур улады толькі загубіць пачатае, не дасць узмацніцца таму станоўчаму, што напрацавана. Рэферэндум замарудзіць ход пераўтварэнняў у самы адказны момант. Больш таго, можа наступіць сапраўдны параліч улады, і згубіцца кантроль над сітуацыяй. Гэта можа абярнуцца неразбярыхай і яшчэ большай безгаспадарчасцю, нават абвалам у эканоміцы, расколам грамадства.

Асабіста я прыхільнік такой рэарганізацыі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, якая зробіць заканадаўчую ўладу больш дынамічнай, актыўнай, працаздольнай. Неабходна ўдасканаліць і работу Прэзідыума Вярхоўнага Савета, магчыма, яго структуру. Прапановы такія ёсць, яны дэтальна распрацаваны і будуць вынесены на ваш разгляд.

Рэарганізацыя — гэта сродак для паляпшэння работы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і яго Прэзідыума. Праекты, на жаль, закранаюць асабістыя інтарэсы народных дэпутатаў, і неабходна мужнасць, каб іх падтрымаць.

Сёння 88 народных абраннікаў Рэспублікі Беларусь сумяшчаюць сваю дзейнасць з кіруючымі пасадамі ў структурах Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і мясцовых выканаўчых органах. А гэта пярэчыць прынцыпу раздзялення заканадаўчай і выканаўчай улады. Таму і тут неабходна рэфармаванне. Нам, паўтараю, патрэбна мужнасць. Мужнасць неабходна і парламенту, і ўраду. Па-першае, каб адстаяць і выканаць свае ўласныя, правільныя рашэнні. Па-другое, каб знайсці сілы прызнаць недакладнасць, некарэктнасць некаторых нашых папярэдніх законаў, пастаноў і рашэнняў і тэрмінова іх выправіць у інтарэсах народа, дзяржавы, справядлівасці. Я маю на ўвазе і падаткаабкладанне, і сацыяльныя праграмы, і пенсіённае забеспячэнне, і нават такую праграму, як чарнобыльская. Без памяркоўнасці, вытрымкі, глыбіннага ўсебаковага аналізу, разлікаў і ўлікаў усіх акалічнасцей нам не вырашыць тыя найскладанейшыя праблемы, якія паставіла перад намі рэчаіснасць, не знайсці правільных падыходаў у эканоміцы, вайсковай справе, сацыяльнай і грамадскай галіне. Давайце працаваць.

З САВЕЦКАЙ АВЕЧКІ—ВОЎНЫ ЖМУТ...

Сённяшняя дэстабілізацыя закранула ўсе без выключэння прадпрыемствы, нават тыя, якія лічыліся да нядаўняга часу адносна ўстойлівымі. У прыватнасці, вось што расказвае галоўны тэхнолаг Мінскага камвольнага камбіната М. ПРАКАПОВІЧ:

— Да леташняга красавіка кілаграм воўны (а гэта для нас асноўная сыравіна) каштаваў 57 рублёў, цяпер — амаль 400. Прычым той жа воўны, нягледзячы на адпаведныя міжурадавыя пагадненні, катастрафічна не хапае. Мы пакуль што трымаемся, але ці надоўга нас хопіць? Па сутнасці, «жылі» да апошняга часу старымі запасамі, прычым пераважна імпартнымі. Бо калі нават пастрыгчы ўсіх авечак на тэрыторыі былога Саюза, то камвольную прамысловасць таго ж Саюза можна забяспечыць сыравінай на 25—30 працэнтаў. Ну, а ў Беларусі ўвогуле амаль няма чаго стрыгчы. «Стрыглі» ў асноўным аўстралійскіх бараноў. За валюту, вядома. А цяпер валюты няма.

Вось і мяркуйце, як мы глядзім у будучыню. Дзякуй яшчэ магілёўскаму «Хімвалакну» — выручаюць «хіміяй». Да 60 працэнтаў сыравіны, якая ідзе ў справу, складае штучнае валакно-лаўсан (дарэчы, ён таксама падаражаў у 10 разоў). Вось вам і камвольная, г. зн. шарсцяная вытворчасць.

Між іншым, сёння многія наракаюць на вытворчаў. І ў першую чаргу ў сувязі з лібералізацыяй цэн. Вельмі часта гэтыя нараканні неапраўданыя. Напрыклад, нашы тканіны сталі даражэйшымі ў 4 разы (непараўнальна з сыравінай). Працуем з рэнтабельнасцю ў межах 20—25 працэнтаў. А вось пакуль дойдзе прадукцыя, скажам, да мінскага магазіна «Беларускія шарсцяныя тканіны», да нашай цаны набягае яшчэ 33 працэнты — 8 базаўскіх і 25 гандлёвых.

Працаваць вельмі складана. Нашы спецыялісты не вылазяць з кірмашоў, усімі праўдамі і няпраўдамі здабываюць сыравіну, гэткія ж дэфіцытныя фарбавальнікі, розныя дапаможныя матэрыялы... Да гаспадарчай неразбярыхі ў цяперашнім СНД далучаецца прававая. А возьмем падатковую палітыку ў рэспубліцы — хіба яна стымулюе вытворцаў?

Прадпрыемствы катастрафічна бяднеюць, слаба абнаўляюцца іх актыўныя фонды, бо многія ў гэтай крайне нестабільнай абстаноўцы накіроўваюць сродкі ў першую чаргу на сацыяльную падтрымку калектываў. Да трэцяй часткі прадпрыемстваў Беларусі на сённяшні дзень «сядзяць» на картатэках, яны — практычна банкруты... Варта было б засвоіць: будуць бедныя прадпрыемствы — беднымі станем усе мы.

КОЛЬКІ «БЕЛАРУСЯЎ» НА БЕЛАРУСІ?

Напярэдадні чарговай сесіі ў рэдакцыю паступіла паведамленне аб арганізацыйным пасяджэнні дэпутацкага аб'яднання «Беларусь». Прадстаўнікі «Звязды» пабывалі на ім. Удзел у пасяджэнні ўзялі дзесьці каля 80 дэпутатаў, у асноўным—гаспадарчыя работнікі, прадстаўнікі структур Саветаў. Мэта аб'яднання, як прагучала на ім, не канфрантацыя з парламенцкай апазіцыяй, не блок у супрацьвагу апошняй, а спроба ўтварыць сілу, здольную вывесці Вярхоўны Савет з тупіка, згуртаваць сілы, што аддаюць перавагу не палітычным, а перш за ўсё эканамічным пераўтварэнням.

— Мы ставім пытанне аб дакладных і ясных прынцыпах, на якіх, па нашаму перакананню, магчыма кансалідацыя людзей рознай палітычнай арыентацыі, — заявіў учора з трыбуны сесіі народны дэпутат Генадзь Казлоў, які напярэдадні быў старшынствуючым і на аргпасяджэнні. — Гэта —прырытэт эканомікі над палітыкай. Сітуацыя занадта сур'ёзная, працэсы распаду зайшлі вельмі далёка... Гэта — не рэвалюцыя, а эвалюцыя. Мы вельмі старанна крычалі «далоў!», вельмі часта дзейнічалі па формуле «до основанья, а затем»... Патрэбны разумныя, паслядоўныя рэформы, а не «вялікі скачок» ад адміністрацыйна-камандная сістэмы ў «царства дэмакратыі». Гэта — не злом, а рэканструкцыя з найвышэйшай адказнасцю і рэалізмам. Роспуск цяперашніх Вярхоўнага Савета і ўрада, на нашу думку, адкіне рэспубліку назад — да таталітарызму, да поўнай страты кіравання народнай гаспадаркай, да эканамічнай бяды. Гэта — не дыктатура дэмакратаў, а канстытуцыйная дэмакратыя... Імкненне парушыць з дапамогай дачаснай замены ўлады натуральны працэс станаўлення маладой дэмакратыі можа прывесці да самых непрадказальных вынікаў, да расколу грамадства... Гэта — павага да мінулага, традыцый народа, вопыту старэйшых пакаленняў. Наша гісторыя—якой бы горкай яна ні была — гэта наша гісторыя. Мы —вялікі народ, і гэта трэба памятаць.

У праграмнай заяве аб'яднання дэпутатаў «Беларусь» значыцца, што аб'ядналіся народныя выбраннікі на пазіцыях здаровага сэнсу, з адной мэтай: перайсці ад слоў і бясконцага звядзення палітычных рахункаў да вырашэння канкрэтных стваральных задач. Стабілізацыя эканамічнага і палітычнага становішча ў рэспубліцы, фарміраванне надзейнай прававой базы станаўлення беларускай дзяржаўнасці, культурнае і духоўна-маральнае адраджэнне нацыі — у гэтым бачыцца новаму аб'яднанню яго асноўнае прызначэнне.

— Галоўны крытэрый, —падкрэсліў Г. Казлоў, — якім мы абавязаліся кіравацца ў сваёй дзейнасці, — кансалідацыя. Таму наша група пазапартыйная. Мы заяўляем аб выхадзе з усіх раней заяўленых груп і фракцый, аб тым, што ўсе сілы маем намер сканцэнтраваць на рабоце ў пастаянных камісіях Вярхоўнага Савета і ў дэпутацкім аб'яднанні «Беларусь».

Яднаць жа дэпутатаў павінна моцная дысцыпліна, а работа будзе каардынавацца ў адпаведнасці з абласным дзяленнем.

Думаем, чытачам будзе цікава «пазнаёміцца» з тымі народнымі выбраннікамі, хто паставіў свае подпісы пад заявай аб стварэнні новага аб'яднання ў парламенце Рэспублікі Беларусь. Гэта: Д. Сівіцкі, А. Цішкевіч, М. Скарынін, М. Федарчук, М. Сцепаненка, С. Бубневіч, С. Лужынскі, І. Макарэвіч, М. Лобач, Ф. Мінько, К. Трухан, У. Ваўчэцкі, В. Русак, І. Ціханаў, А. Пазюмка, П. Катушкін, В. Саковіч, І. Цярэшка, У. Андрэйчанка, А. Вайцешык, М. Крывецкі, С. Барсукоў, У. Дражын, В. Бурачкоў, А. Герасіменка, М. Васілеўскі, М. Веславухаў, В. Ермалаеў, А. Мардашоў, М. Бойка, У. Студзянцоў, І. Авін, Г. Лавіцкі, Т. Анісенка, В. Чэпік, А. Кузмянкоў, В. Трафіменка, М. Марыніч, В. Піскароў, Р. Самусевіч, З. Пянькова, У. Гаркун, А. Кулічкоў, І. Калмычкоў, М. Сапранецкі, М. Грыб, В. Мядзелец, В. Вялічка, А. Сцепаненка, А. Мядзведзеў, М. Шакаў, М. Алешчанка, П. Драбышэўскі, М. Грынёў, У. Чакушоў, Б. Макейчанка, Д. Арцыменя, І. Машко, М. Салдатаў, А. Калодка, В. Казяк, І. Трусаў, М. Казючыц, М. Зайцаў, В. Паўлаў, Г. Казлоў, М. Удовікаў, У. Кулакоў, В. Федарэнка, У. Уранюк, В. Даніленка, М. Якубец, З. Ломаць, П. Пракапові, З. Крупнік, А. Сакалоў, У. Кавалёнак, А. Лукашоў.

Як запэўніў Г. Казлоў, подпісаў будзе больш...

І яшчэ адзін факт з арганізацыйнага пасяджэння аб'яднання «Беларусь». Акрамя дэпутатаў, на ім выступіў адзін з кіраўнікоў Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі Аляксандр Санчукоўскі. Ён сказаў, што асацыяцыя гатова падтрымаць аб'яднанне ў любой форме, аж да матэрыяльнай, калі яго дзейнасць будзе накіравана на выратаванне сітуацыі ў эканоміцы.

Чым стане для парламента гэтае новае фарміраванне? Пакажа, вядома ж, час. Сіла, у любым выпадку, немалая — хопіць рук і кнопак, каб надаць вагу любому рашэнню. Хочацца заўважыць толькі адно: ці не зашмат у нас аб'яднанняў, суполак, рухаў, якія ўзялі на сябе смеласць гаварыць за Беларусь? «Новая Беларусь», «Русь Белая», проста «Беларусь»... Ці будзе за святой для нас назвай адпаведная адказнасць?..

Парламенцкія карэспандэнты «Звязды».

ЭКАНОМІКА

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ І «ПРЫХВАТЫЗАЦЫЯ»

Пакуль прадстаўнікі Савецкай улады мёртвай хваткай трымаюцца за сваё права рэгламентаваць адносіны ўласнасці, сама ўласнасць ужо пайшла па руках. Па той простай прычыне, што ўлады ў гэтых прадстаўнікоў даўно ўжо няма, як, між іншым, няма яе, рэальнай, і ў якіх-небудзь іншых прадстаўнікоў. У палітыцы — міжцарства, у эканоміцы — бязмежжа.

Колькі ўжо насмешак было ў адрас ідэолагаў народнай прыватызацыі. Прыхільнікаў гэтай ідэі абвінавачваюць у тым, што яны, як у 1917 годзе, хочуць звесці справу да ўраўнілаўкі — падзяліць дзяржмаёмасць паміж усімі пароўну. Але ў 1917 годзе рабавалі нарабаванае, а тут гаворка ідзе аб вяртанні. Праціўнікі ідэі сцвярджаюць, што атрыманыя так лёгка інвестыцыйныя паі нашы людзі прап'юць. Але вось пытанне: а чаму п'юць? Можа, і п'юць таму, што нічога не маюць, што ні за што не адказваюць? Можа, не хочуць павышаць свой культурны і адукацыйны ўзровень, таму што як быццам няварта — усё вырашыць міністр, дырэктар, начальнік, гаспадар. Навошта той галаўны боль з-за «нічыёй» дзяржаўнай маёмасці або з-за гаспадарскага дабра? Атрымаўшы свой, сумленна зароблены ім і яго бацькам і дзедам інвестыцыйны пай, кожны вольны будзе вырашаць, што з ім рабіць далей. Адзін свае 10—15 тысяч інвестыцыйных грошай прадасць за 300—500 тысяч папяровых, другі аб'яднае свой капітал з капіталам родных і сяброў, трэці купіць кватэру, чацвёрты ўкладзе ў акцыянернае таварыства, а пяты, напэўна, сапраўды прап'е. Кожнаму сваё. Але калі мы не пойдзем гэтым шляхам, а народ калі-небудзь прачнецца і ўбачыць, што ўсе КамАЗы і Гомсельмашы ўжо разабраны, то быць у нас яшчэ аднаму кастрычніку 1917 года, дакладней — 199... года.

Часцей за ўсё праціўнікі ідэі народнай прыватызацыі заяўляюць, што ад увядзення паёў колькасць грошай у дзяржавы павялічыцца ў некалькі разоў. Карыстаючыся доступам да сродкаў інфармацыі і больш высокай ступенню адукацыі ў параўнанні з асноўнай масай рабоча-сялянскага насельніцтва, ім ужо амаль удалося пераканаць у гэтым людзей. Але такая «вутка» разлічана на прастакоў. Чалавек, які большменш разбіраецца ў эканоміцы, зразумее, што інвестыцыйныя грошы — гэта не «драўляныя» рублі і што па канверсуемасці яны вышэй за долар, таму што забяспечаны не таварамі, а маёмасцю, што гэта — капітал. Інвестыцыйныя грошы ў гандлі прымацца не будуць.

У арсенале праціўнікаў ёсць і такі аргумент: пры нашай усеагульнай эканамічнай і юрыдычнай няграматнасці людзі не змогуць правільна распарадзіцца сваім паем. Таму, маўляў, лепш аддаць дзяржаўную маёмасць кемлівым бізнесменам, (якія спачатку абрабуюць народ, затое потым азалацяць). Асабіста мяне такая перспектыва не задавальняе, бо я разумею, што краіна становіцца на шлях капіталістычных адносін. Можна сарамліва называць іх рыначнымі, можна яшчэ якое абцякальнае азначэнне прыдумаць, але гэта сутнасці не мяняе. Я таксама разумею, што капіталізм немагчымы без першапачатковага накаплення капіталу. Гэта аксіёма. А першапачатковае накапленне капіталу — гэта Еўропа XVIII стагоддзя з усімі адсюль вынікамі. Калі мы пойдзем гэтым шляхам, то прыйдзем к 2050 году не да амерыканскага капіталізму 2000-га (ды і ці да капіталізму?), а ўрачыста ўедзем у Англію XIX стагоддзя. Такі шлях мне не падыходзіць. І ўсяму народу яго таксама не зычу.

Прыводзяцца і іншыя аргументы супраць народнай прыватызацыі. Пад гэты дружны хор у краіне амаль не адбываецца законнай рэформы дзяржуласнасці. Узнікаюць, развіваюцца і зацвярджаюцца новыя гаспадарчыя структуры. Аднак ля іх руля становяцца дзяржаўныя служачыя, якія абавязаны па службе кантраляваць тыя самыя структуры. Яны самі сабе за бясцэнак прадаюць дзяржмаёмасць, самі сабе плацяць мізэрныя падаткі, самі ад сябе абараняюць рабочы люд, які прыходзіць скардзіцца на беззаконнасць. Сённяшні хаос задавальняе ўсіх, хто мае ўладу. Рабуюць, карыстаючыся выпадкам, былыя «чырвоныя», рабуюць яшчэ галодныя цяперашнія «белыя» — куды беднаму селяніну падацца? Падняслі сыр-бор з-за партыйнай маёмасці. Галоўныя зладзеі крычаць: «Трымай злодзея!» А пад шумок расцягваюцца больш значныя каштоўнасці.

Патрэбны законы, шмат законаў. Ф. Рузвельт для таго, каб перайсці ад рыначнай капіталістычнай эканомікі да рыначнай посткапіталістычнай, за чатыры гады ўвёў 70 новых законаў. А колькі трэба законаў нам, каб перайсці ад камандна-адміністрацыйнай эканомікі да рыначнай? Не менш як 150! Калі ж працаваць пачнём, паны-таварышы дэпутаты?

Трэба тэрмінова разабрацца і ўвесці антыманапольнае заканадаўства. А пасля гэтага паглядзець, ці ўсе, хто нахапаў народнай маёмасці, змогуць прасачыцца праз гэты закон.

Яшчэ адзін некантралюемы канал антынароднай прыватызацыі — пераход на арэнду з выкупам, які дазваляе адгарадзіць уласнасць ад народа. Ён апраўданы толькі ў сэнсе адпампоўвання лішніх грошай. Трэба неадкладна вызначыць пералік аб'ектаў або іх частак для бязвыплатнага размеркавання і продажу, камбінаваць два шляхі прыватызацыі — бясплатны і платны. Гэта дасць людзям выбар. Скажам, чалавек адпрацаваў 20 гадоў на заводзе, але вырашыў адкрыць сваю справу ў гандлі. Далучыўшы атрыманы інвестыцыйны пай да зберажэнняў, зароблены сумленнай шматгадовай працай, ён можа набыць ва ўласнасць магазін. Пасля вызначэння пераліку аб'ектаў для прыватызацыі можна лёгка разабрацца, якая маёмасць у перыяд беззаконня была прыватызавана, а якая «прыхватызавана».

Найважнейшым пытаннем прыватызацыі стане пытанне ацэнкі маёмасці. Яе поўная балансавая ацэнка і астаткавая не маюць нічога агульнага з сучаснымі рыначнымі цэнамі. Таму на адзін інвестыцыйны пай можна набыць зусім розны па кошту капітал. Той, хто ўмудрыўся ўкласці грошы ў старое прадпрыемства ў перыяд нізкіх цэн, рэальна атрымае ў 8—20 разоў больш, чым той, хто ўклаў сродкі ў новае прадпрыемства, пабудаванае ў перыяд інфляцыі. Знойдуцца і такія аб'екты, якія могуць ужо наогул нічога не каштаваць. Трэба ўсё пераацаніць па рыначных цэнах. Потым, пасля ўсіх названых вышэй аперацый, трэба падзяліць кошт рэспубліканскай маёмасці на колькасць насельніцтва. Гэта і вызначыць размеры пая кожнага. Гэтым спосабам мы зможам пазбегнуць новага варыянта дыктатуры пралетарыяту. Толькі так мы не забудзем пра акадэмікаў, дворнікаў, урачоў, журналістаў, настаўнікаў і г. д., якія зрабілі для эканомікі рэспублікі не менш любога, а ўлічваючы розніцу ў зарплаце рабочага і ўрача, то, бадай, і больш.

Цяпер ідзе работа над законам аб прыватызацыі ў рэспубліцы. Не памыліцеся, дэпутаты, бо гэта будзе ўсім нам вельмі дорага каштаваць. Разумныя людзі вучацца на памылках іншых, а дурні—на сваіх. Не паўтарайце памылак Расіі, дзе паповы і лужковы паміж сабой ужо ўсё падзялілі і высяляюць людзей з добрых дамоў у «хрушчоўкі». І ўсё «законна». Спыніце падзел на «дэмакратаў» і «кансерватараў». Успомніце: калі чалавек не быў дэмакратам у маладосці — у яго няма сэрца, а калі ён не кансерватар ў старасці—у яго няма розуму.

Юрый КЛІНЦОЎ,
пралетарый разумовай працы
(настаўнік гісторыі СШ № 9 Гомеля).

Прыборы радыелагічнага кантролю — бытавыя дазіметры РКСБ-104 і РКСБ-104/1 выпускае мінскі завод «Радыян». Атэставаныя Рэспубліканскім цэнтрам стандартызацыі і метралогіі, яны дазваляюць з дастатковай дакладнасцю вымяраць узровень радыяцыйнага фону.

Гэты здымак зроблены на ўчастку механізаванай устаноўкі радыеэлементаў. За работай — аператары Любоў БУЛЫНКА і Васіль МАЙКЕВІЧ.

Фота Юрыя БОНДАРАВА.

ПУНКТ ПОГЛЯДУ

Спажывец па-за законам

Цэны з пачаткам іх лібералізацыі рэзка падскочылі, а якасць тавараў і паслуг, наадварот, працягвае зніжацца. Пра гэта сведчаць скаргі грамадзян, што паступаюць у Таварыства спажыўцоў. Вытворцы тлумачаць сітуацыю пагаршэннем матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, зніжэннем якасці камплектуючых і матэрыялаў. І гэта сапраўды так. Але ўзнікае пытанне, чаму за ўвесь гэты хаос у эканоміцы павінны расплачвацца радавыя грамадзяне?

На Украіне, у Казахстане, Расіі прыняты законы «Аб ахове правоў спажыўцоў», якія без лішняй цяганіны дазваляюць грамадзянам спагнаць з несумленных прадаўцоў і вытворцаў нанесены ўрон і зрабіць абмен няякаснага тавару. Такія законы з'яўляюцца важнейшым элементам рыначнай эканомікі. Невыпадкова ў такой краіне, як Японія, у сферы прававой абароны спажыўцоў дзейнічаюць больш за 50 агульнанацыянальных законаў, а ў ЗША — больш за 150.

Незразумела, чаму нашы Вярхоўны Савет і ўрад пайшлі на лібералізацыю цэн, не прыняўшы папярэдне адпаведных рыначных законаў, якія абараняюць спажыўца? Праект жа Закона «Аб ахове правоў спажыўцоў» накіраваны ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь больш года назад. Некалькі месяцаў назад Таварыства спажыўцоў звярнулася з гэтай нагоды з афіцыяльным запытам у Савет Міністраў. Аднак рэакцыі ў адказ не было. Выклікае здзіўленне і тая акалічнасць, што «прасоўванне» гэтага закона ў Саўміне даручана ўпраўленню тавараў народнага спажывання, гандлю і паслуг насельніцтву, якое ў большай меры выказвае інтарэсы вытворцаў і гандлю, а ім закон, што абараняе правы грамадзян, не патрэбны, таму што ён падрывае іх манапалізм. Невыпадкова ў Расіі пытаннямі абароны правоў спажыўцоў займаецца Дзяржаўны камітэт па антыманапольнай палітыцы і падтрымцы новых эканамічных структур.

Нашым ураду і Вярхоўнаму Савету трэба было б пераняць вопыт дзяржаўнай абароны спажыўца ў краінах з рыначнай эканомікай. Напрыклад, у ЗША, акрамя магутнай грамадскай арганізацыі — саюза спажыўцоў, што аб'ядноўвае больш за 5 мільёнаў чалавек і падтрымліваецца ўрадам, створана сістэма дзяржаўных органаў, якія забяспечваюць абарону спажыўцоў. У Прэзідэнта ЗША ёсць саветнік па справах спажыўцоў, які кіруе адпаведным упраўленнем. З урадавых службовых асоб таксама створаны савет па справах спажыўцоў. Найбольшымі ж паўнамоцтвамі ў ЗША валодае камісія па бяспецы спажывецкіх тавараў. Штодзённа з усіх канцоў краіны ў камісію паступаюць паведамленні (каля 2 тысяч) з аддзяленняў хуткай дапамогі, шпіталяў і іншых арганізацый аб таварах і паслугах, якія ўяўляюць небяспеку для жыцця і здароўя грамадзян. Акрамя таго, па шасці тэлефонных лініях няспынна прымаюцца скаргі. Інфармацыя абагульняецца, аналізуецца, і потым прымаюцца адпаведныя меры. Камісія мае права забараніць продаж і вытворчасць небяспечных тавараў, аштрафаваць вытворцаў і прадаўцоў да 1 мільёна долараў. Праводзячы наглядную дзейнасць, камісія мае права змяняць і ўводзіць новыя стандарты. Яе прадпісанні абавязковыя для прадаўцоў і вытворцаў і выконваюцца неадкладна і ў тэрмін.

На жаль, грамадзяне Рэспублікі Беларусь пакуль не могуць разлічваць на такую абарону з боку сваіх улад. Насельніцтва пазбаўлена элементарнай інфармацыі аб якасці прадуктаў харчавання, аб небяспечных якасцях тавараў і іх надзейнасці. Больш таго, грамадская думка часта адводзіцца ад сапраўднай небяспекі. Напрыклад, нітраты, вакол якіх столькі шуму, па сцвярджэнню спецыялістаў, у сотні разоў менш небяспечныя (а ў пэўнай колькасці нават неабходныя арганізму) за пестыцыды і прадукты іх распаду, солі цяжкіх металаў і іншыя хімічныя забруджвальнікі, якімі нашпігаваны прадукты харчавання, вада і глеба. У выніку некампетэнтнага падыходу да праблемы бяспекі сродкі часта выдаткоўваюцца не на галоўныя мэты. Сёння любая харчовая лабараторыя можа вызначыць утрыманне нітратаў у прадуктах. А вось з 280 назваў пестыцыдаў, што выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы, методыкі распазнання існуюць толькі па 10 назвах.

Ствараецца ўражанне, што ва ўрадзе пакуль проста адсутнічае якая-небудзь канцэпцыя дзейнасці ў гэтым напрамку.

Закон «Аб ахове правоў спажыўцоў» якраз і павінен змяшчаць у сабе аснову для арганізацыі эфектыўнай работы па павышэнню якасці і бяспекі прадуктаў харчавання, тавараў і паслуг, забяспечыць прававую абарону інтарэсаў грамадзян. Таму таварыства спажыўцоў настойвае на неадкладным прыняцці Вярхоўным Саветам гэтага закона.

В. КАРАЛЮК,
намеснік старшыні Мінскага гарадскога таварыства спажыўцоў.

НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА



Была Чорная Русь, была Чырвоная, ёсць Русь Белая, але ніколі не было і (дай, неба!) ніколі не будзе Русі Шэрай.

Леанід ДАЙНЕКА.

Горад сівой легенды

МІНУЛА 740 ГАДОЎ З ЧАСУ ПЕРШАГА ЎПАМІНАННЯ Ў ІПАЦЬЕЎСКІМ ЛЕТАПІСЕ ГОРАДА НАВАГРАДКА

ХУТКА СЦЯМНЕЛА, і нязмоўклы шум бору, жаласлівы скрып сухіх алешын адразу ж сціхлі пасля апошняга, але рэзкага парыву ветра-паўночніка. Галоўная брама замка была ўжо зачынена, і цяпер ніхто не мог трапіць на дзядзінец без асаблівага дазволу. Зусім нядаўна да Новагародскіх сцен падыходзілі жалезнай гарой чужынцы з далёкага Марыенбурга. Вядома ж, не з мірам ішлі. Дружына князя Ізяслава Васількавіча, выйшаўшы насустрач, сваімі мячамі і дзідамі добра-такі пералічыла рэбры ў няпрошаных гасцей, пагнала іх за Нёман. Ці надоўга спакой? Даўно спіць у трывожнай цішыні горад. Не спіць толькі варта. І закаханыя. Ды варочаецца ў сваёй пасцелі князь Ізяслаў — не спакойна на Чорнай Русі стала. Ціснуць ворагі і з усходу і з захаду. Арда, падмяўшы пад сябе залатагаловы Кіеў, таго і глядзі, з'явіцца на берагах Нёмана і не хопіць тады ніякай сілы, каб спыніць вузкавокіх заваёўнікаў. А тут яшчэ нямчына ўзнімаецца. Тэўтонскія рыцары ў белых плашчах з чорнымі крыжамі, атрымаўшы благаслаўленне рымскага папы, пайшлі ўжо вайной вялікай на прусаў і жамойтаў, бы паганцы тыя. Новагародская зямля, хоць і хрышчаная даўно, ды гараць яшчэ ў пушчы знічы і Пяруну. Не могуць радаваць вока папскіх пасланцоў макаўкі купалоў царквы Барыса і Глеба. Едуць лаціннікі ў Новагародак, пагражаюць, патрабуюць адмовіцца ад праваслаўя. Жыцця ад іх не стала. Вось і на той сядміцы быў адзін. Не вытрымаў князь нарэшце, загадаў сабак спусціць на пацеху чэлядзі. Тая ж покатам клалася, гледзячы, як пасланнік з усіх ног імчаў да брамы, падабраўшы сваю чорную перапярэзаную сярмягу, аж лыткі блішчалі. Але ж так доўга працягвацца не можа. На гэты раз пашанцавала, адбілі непрыяцеля. А што будзе заўтра? Трэба шукаць новага саюза з суседзямі. Найперш з Міндоўгам, думаў Ізяслаў, яго Літва клінам урэзалася паміж Новагародкам і Менескім княствам. Разам бы стаялі на Нёмане і супраць арды, і супраць крыжакоў.

А на досвітку ў галоўную браму моцна загрукалі: прымчаўся ў Новагародак сам Міндоўг з невялікай дружынаю. Не па сваёй волі прыбег кунігас: родны брат Даўспрунк з сынамі выжыў яго з Варуты. Вось і давялося шукаць паратунку тут, у Новагародскай зямлі...

ТУТ, ЗДАЕЦЦА, МЫ І ПАДЫШЛІ ДА ТАГО ДНЯ, калі Новагародак упершыню трапляе ў летапіс. Кароценькі запіс: у лета 1252 прыйшоў Міндоўг у Новагародак і «нача ту княжити». Не так усё проста было на справе. Мы ведаем ужо, як ён «прыйшоў», да таго ж, Ізяслаў Васількавіч лічыўся добрым яго сябрам, калі можна ўжыць тут такое слова. Застаецца адно — змова. Новагародская знаць, купцы і рамеснікі не былі задаволены апошнім часам князем Ізяславам: моцна прыціснуў братэрствы, дыхаць не дае. Сам жа не імкнецца мячом далучаць на Новагародка новыя, багатыя землі. Ды і рыцары, тэўтонскія і лівонскія, не баяліся ўжо стаць на яго дарозе. Вось так і «нача княжити» Міндоўг.

Гэта старонка, бадай, самая галоўная і цікавая ў васьмівяковай летапіснай гісторыі Новагародка. У гэты час, у сярэдзіне XIII стагоддзя, па сваім эканамічным і культурным развіцці Новагародская зямля выходзіць на першае месца сярод іншых беларускіх зямель. На жаль, наша гістарычная навука вельмі мала ўвагі ўдзяліла ёй. Не вывучана як след, у прыватнасці, роля Новагародка ў справе аб'яднання беларускіх зямель.

Сваё ж развіццё Новагародская зямля пачала ад часу заснавання самога Новагародка, які некаторыя вучоныя адносяць да 1116 года, а іншыя, у прыватнасці Мікола Ермаловіч, да 1044-га. Менавіта тады, піша гісторык у сваёй працы «Старажытная Беларусь», Яраслаў Мудры заклаў горад пасля свайго паходу на Літву як аплот валодання Кіева над гэтым краем, а ўжо ў 1066 годзе полацкі князь Усяслаў, спрабуючы рассячы вузел полацка-кіеўскіх супярэчнасцей, напаў на Новагародак. Але няўдала. У 1119 годзе Глеб Меньскі таксама паспрабаваў захапіць горад. Затым на працягу двух стагоддзяў Новагародак часта пераходзіў з рук у рукі. Вырваўшыся з-пад улады Кіева, ён трапіў пад уплыў галіцка-валынскіх князёў. І толькі ў 40-х гадах XIII стагоддзя яму ўдалося вырвацца з-пад Валыні і пачаць ажыццяўленне сваіх дзяржаўных мэт.

Усё спрыяла развіццю горада: урадлівыя землі Нёмання, добра развітыя земляробства і жывёлагадоўля, шматлікія рамёствы. Тут выплаўлялася жалеза і выпускаліся вырабы з яго, апрацоўваліся таксама каляровыя і каштоўныя металы. Быў добра наладжаны гандаль, у тым ліку і з замежнымі краінамі.

Услонім, Ваўкавыеск, Здзітаў, Свіслач з'яўляліся цэнтрамі ўдзелаў, але ўсе яны шчыльна прымыкалі да Новагародка, а цэнтральнае значэнне горада і вызначала назву гэтай зямлі. Летапісы не зарэгістравалі ніводнага выпадку міжусобнай барацьбы яе князёў. Вялікімі князямі былі з 1238 года Ізяслаў Васількавіч, а з 40-х гадоў—Міндоўг, які, далучыўшы Літву, стаў першым вялікім князем аднаго з моцных дзяржаўных утварэнняў у тагачаснай Еўропе. У 50—60-я гады горадам валодалі спачатку Раман Данілавіч Галіцкі, затым Войшалк, сын Міндоўга, у канцы XIII стагоддзя—вялікі князь Трайдэн, пасля — Міхал Гедымінавіч Карыян, яго сын Хведар, Дзмітрый Альгердавіч Карыбут. А з 1394 года Новагародак становіцца адным з цэнтраў вялікакняжацкага дамена, ім кіравалі цяпер намеснікі вялікіх князёў.

Еўропа ў гэты час зведвала вялікія беды: Русь заваявана манголамі, Прусія, Польшча падвяргаліся спусташальным набегам крыжакоў. Беларускае ж Панямонне было адносна спакойным краем. Не сказаць, праўда, каб зусім, бо Новагародак к канцу XVI стагоддзя сам зведаў ажно тры татарскія і пяць крыжацкіх набегаў, але ўсё ж многія прадстаўнікі народаў Усходняй Еўропы ратаваліся менавіта тут, уносячы разам з тым свой уклад у развіццё гэтай зямлі. А ў выніку, як лічыць М. Ермаловіч, высокае эканамічнае і культурнае развіццё, канцэнтрацыя вялікіх багацццяў у руках новагародскіх феадалаў, умацаванне іх улады павялічвала палітычную вагу зямлі сярод іншых гістарычных абласцей Беларусі і дало ёй магчымасць стаць новым цэнтрам кансалідацыі беларускіх зямель у цэлым.

У 1448, 1508, 1538 гадах тут праводзіліся сеймы Вялікага княства Літоўскага, а з 1416 года знаходзілася рэзідэнцыя праваслаўных мітрапалітаў княства (да сярэдзіны XVI стагоддзя ў горадзе налічвалася 10 цэркваў). Пасля Брэсцкай уніі была рэзідэнцыя уніяцкіх мітрапалітаў. Прыбалізна з гэтага ж часу ў Новагародку сталі праводзіцца сесіі Галоўнага Літоўскага трыбунала.

Усе важныя падзеі адбываліся ў гістарычным цэнтры горада — Замку. Яго будаўніцтва пачалося, па адных звестках, у XI стагоддзі, па іншых — у пачатку XIII-га. Замкавая гара вышынёй 20 метраў умацоўвалася яшчэ 10-метровым ровам і валам. У канцы XIV стагоддзя, пасля апошняга крыжацкага набегу, была пабудавана пяціпавярховая цэнтральная вежа — Шчытоўка. Вышыня яе дасягала 25 метраў, а таўшчыня сцен на ўзроўні першага паверха — 2,7 метра. Пазней, ужо ў 1505 годзе, дабудавалі яшчэ чатыры трохпавярховыя вежы, якія былі злучаны сцяной. Гэта дапамагло двойчы вытрымаць жорсткія баі і асаду крымскіх татар. Іх апошні набег адбыўся ў 1506 годзе. І толькі ў перыяд Паўночнай вайны шведскія войскі захапілі Замак і ўзарвалі яго. Аднавіць гэты выдатны помнік абарончага дойлідства ўжо не ўдалося. А яшчэ праз дзевяноста гадоў, пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Расіяй, Аўстра-Венгрыяй і Прусіяй, Наваградак — павятовы горад у саставе Расійскай імперыі. Шматлікія рамёствы паступова набылі саматужны характар, заняпаў з цягам часу і гандаль, частыя пажары вынішчалі да трэці горада, зменшылася колькасць яго насельніцтва. Усё гэта і прывяло да таго, што велічная слава Новагародка паступова закацілася. Але подых гісторыі адчуваецца тут на кожным кроку і сёння.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

ВАША ПІСЬМО АТРЫМАЛІ

Калі ненармальныя справы камунальныя...

«Паважаная рэдакцыя, адгадай загадку. Не карыстаюся і не хачу, а ўсё роўна плачу. Што гэта? Не ведаеш? Ды гэта самы звычайны ліфт. А справа вось у чым. Мы жывём у кааператыўным доме, на першым паверсе. Натуральна, ліфтам не карыстаемся, ды, па сутнасці, ён нам не патрэбен. І пытанне маё такое: павінны мы плаціць за ліфт ці не?».

За адказам на запыт чытачкі В. Васіленка з г. Слуцка мы звярнуліся ў жыллёва-юрыдычны аддзел Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі рэспублікі. Там правільна зразумелі аўтара пісьма. Сапраўды атрымліваецца нейкі абсурд: чалавек не карыстаецца тым жа ліфтам і плаціць за яго.

Праўда, у адпаведных заканадаўчых актах канкрэтна аб плаце за ліфт нічога не сказана. Затое ў Прыкладным статуце жыллёва - будаўнічага кааператыва (ЖБК), зацверджаным яшчэ Саветам Міністраў БССР 19 лістапада 1984 года, гаворыцца, што член ЖБК абавязаны «несці расходы па ўтрыманню і эксплуатацыі дома (дамоў), плаціць ва ўстаноўленыя тэрміны ўзносы ў памерах, вызначаных агульным сходам членаў кааператыва ці іх упаўнаважаных».

Што датычыцца платы за ліфт для жыхароў першага паверха, то яна ў кожным кааператыве можа быць устаноўлена па рашэнню яго праўлення ці агульнага сходу. Як кажуць, думайце і вырашайце самі: плаціць ці не плаціць.

●

Многія пажылыя адзінокія людзі маюць уласныя дамы. Зразумела, цяжка такому чалавеку весці хатнюю гаспадарку, займацца рамонтам памяшкання, вырашаць іншыя штодзённыя пытанні. Ён гатоў сваё жыллё аддаць у распараджэнне раённага ці гарадскога выканкома, а ўзамен просіць выдзеліць яму аднапакаёвую кватэру з камунальнымі зручнасцямі. Ці магчымы такі варыянт абмену?

Гэта жыццёва важнае для адзінокага і нямоглага чалавека пытанне не такое простае, як можа здацца на першы погляд. Так, згодна з пастановай Саўміна рэспублікі ад 20.05. 1991 г., дазволены абмен жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду, а таксама фонду жыллёвых і жыллёва-будаўнічых кааператываў на дамы (кватэру), якія належаць грамадзянам на праве прыватнай уласнасці.

Але гэта зусім не значыць, што такой працэдурай абмену абавязаны займацца раённы ці гарадскі выканком. Тут клопат перш-наперш самога домаўладальніка. Іншая справа, калі выканком ідзе яму насустрач, бярэцца дапамагчы. Але, гэта, як кажуць, яго ласка, добрая воля. Затое, падкрэслім, прымусіць зрабіць так у абавязковым парадку ніхто не можа.

Вядома, нікуды не варта, калі такому прыватніку паабяцаюць, абнадзеяць, а потым бездапаможна разводзяць рукамі: маўляў, не можам, не хадзіце і не прасіце. А менавіта так часам і бывае ў некаторых выканкомах, што не робіць ім гонару.

Трэба мець на ўвазе і такую тонкасць гэтай аперацыі. Пры дасягненні дамоўленасці аб абмене на падставе рашэння выканаўчага камітэта мясцовага Савета натарыяльна зацвярджаецца дагавор мены і грамадзяніну, які атрымлівае права ўласніка жылога дома (кватэры), у бюро тэхнічнай інвентарызацыі выдаецца адпаведнае рэгістрацыйнае пасведчанне. У сваю чаргу яго партнёру — таму, хто атрымлівае права наймальніка жылога памяшкання (або ўступае ў ЖБК), уручаецца абменны ордэр.

На нашу думку, каб аблегчыць жыццё адзінокіх састарэлых людзей, пазбавіць іх ад лішніх турбот, варта было б мець у выканкоме спецыяльны абменны фонд, так званы банк жылля, прызначанага для такіх мэт. Тады чалавек пры неабходнасці змог бы без валакіты здаць свой дом ці кватэру і атрымаць тое, што яму патрэбна і больш за ўсё падыходзіць. Безумоўна, гэта нялёгкая, сур'ёзная праблема, аднак рана ці позна вырашаць яе давядзецца. Само жыццё паставіла перад намі гэта пытанне.

●

У лісце, што даслала Л. Захарута з Віцебска, размова ідзе таксама пра абмен жылля. «Наш дом, — піша яна, — знеслі ў 1978 годзе, далі нам з мужам двухпакаёвую кватэру з усімі выгодамі. Таму за знесены дом не заплацілі. Цяпер, калі я засталася адна, два пакоі мне не патрэбны».

Аўтар пісьма тлумачыць, што і плаціць трэба было больш з невялікай пенсіі. Ды і разумела яна: многія сем'і туляцца ў аднапакаёўках, інтэрнатах. На прыватных кватэрах. Адным словам, пенсіянерка памяняла сваю двухпакаёвую.

А зараз, калі ідзе продаж і прыватызацыя жылля, жанчына пытаецца, ці мае яна права атрымаць сваю новую кватэру ў прыватную ўласнасць, улічваючы, што пры зносе дома іх сям'і не была выплачана кампенсацыя?

У Палажэнні аб продажы грамадзянам кватэр, зацверджаным пастановай Савета Міністраў рэспублікі ад 22 лютага 1991 года № 67, сказана: «Кватэры, атрыманыя грамадзянамі ў дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду ў выніку зносу дамоў, якія належалі ім на правах прыватнай уласнасці, і ў сувязі з выкарыстаннем зямельных угоддзяў для дзяржаўных або грамадскіх патрэб, і калі яны не атрымалі за гэтыя дамы грашовай кампенсацыі, перадаюцца ім ва ўласнасць бясплатна».

У той жа час гэта правіла не распаўсюджваецца на наследнікаў указаных грамадзян, а таксама на выпадкі, калі ў выніку грамадзянска-прававых здзелак ці па іншых прычынах чалавек страціў права на карыстанне гэтай кватэрай. У даным выпадку ў сувязі з абменам.

Аддзел пісьмаў «Звязды». (Тэлефон 32-04-52).

СКАЎТ—ГЭТА ГУЧЫЦЬ ГОРДА

Гурткі моладзі, узнікшыя ў Маскве ў 1880—1890 гг., якімі кіраваў вядомы беларускі пісьменнік Антон Лявіцкі (Ядвігін Ш.), былі першымі ластаўкамі ў выхаванні і згуртаванні беларускай моладзі. Гурткі моладзі, узнікшыя ў 1906 годзе ў шэрагу настаўніцкіх семінарый Маладзечна, Полацка, Нясвіжа, Гродна, Слуцка, Вільнюса, кіраваліся Беларускай Сацыялістычнай Грамадой.

Значна актывізавалі маладзёжны рух выйшаўшыя ў 1906 годзе газеты «Наша доля» і «Наша ніва». Моладзь у гуртках беларускай мовы вывучала геаграфію, гісторыю, ставіла спектаклі ў гарадах і вёсках. Асабліва паспяхова прапагандавалі мову і мастацтва, народныя песні вучні фельчарскай і хіміка-тэхнічнай школ, настаўніцкага інстытута г. Вільні.

Праца ў гуртках з моладдзю на працягу 15 гадоў дала свой плён. Восенню 1921 года арганізаваліся першыя дружыны Крывіцкіх скаўтаў з вучняў Клецкай і Нясвіжскай гімназій, якія праіснавалі да 1924 года, да часу закрыцця гімназій. Другім значным асяродкам беларускага скаўтызму была Віленская беларуская гімназія. Скаўцкі рух тут пачаўся восенню 1922 года, а ініцыятарам яго быў вядомы дзеяч Сымон Рак-Міхайлоўскі. У 1923 годзе арганізацыя налічвала больш за 100 сяброў. Рост беларускага скаўцкага руху быў спынены польскімі ўладамі, якія ў той час ліквідавалі розныя беларускія арганізацыі моладзі. І толькі ў 1926 годзе, дзякуючы дапамозе амерыканскіх метадыстаў сп. сп. Браўн і Броўн, была заснавана пры беларускім жаночым інтэрнаце ў Вільні дзявочая скаўцкая арганізацыя пад назвай «Сёстры вогнішча». Яна праіснавала да 1929 года. У гэты самы час ажыццяўлялісся спробы ўзнаўлення скаўцкага руху сярод хлопцаў нелегальным спосабам, але яны не мелі поспеху. І толькі ў 1934 годзе ўдалося ўзнавіць арганізацыі беларускіх скаўтаў пры Віленскай гімназіі. Дарэчы, яны прымалі ўдзел у міжнародным скаўцкім фестывалі ў г. Аполе (Польшча). Душой скаўцкага руху ў той час быў ксёндз д-р Станіслаў Гілякоўскі, якога закатавалі немцы ў канцэнтрацыйным лагеры. У пасляваенныя гады (1945—1949) Крывіцкія скаўты разам са скаўтамі з Прыбалтыкі і Украіны апынуліся на тэрыторыі Нямеччыны.

Крывіцкія скаўты ў 20-я гады выдавалі свае друкаваныя нядзельныя часопісы «Усход», «Рунь», «Зорка», дзе змяшчалі маленькія апавяданні, п'есы, вершы. Дзейнасць Крывіцкіх скаўтаў на Нямеччыне была вельмі актыўнай. Яны правядзілі з'езды Згуртавання скаўтаў чужыны (ЗКСЧ), на якіх вырашалі пытанні захавання роднай культуры, падрыхтоўкі чытанак для дзяцей, выдавалі літаратуру для скаўтаў і скаўцкіх кіраўнікоў, вырашалі пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай моладзі да жыцця за мяжой. За гэтыя гады яны выдалі шэраг часопісаў і кніг.

У 1947 годзе Згуртаванне скаўтаў (ЗКСЧ) было зарэгістравана ў Міжнародным скаўцкім бюро ў Лондане. З 1950 года скаўты з Нямеччыны пераехалі жыць у розныя краіны свету, у тым ліку і ў Амерыку і далёкую Аўстралію, і там працягвалі паспяхова працаваць.

У Беларусь за два апошнія гады прыязджалі кіраўнікі скаўцкіх арганізацый амаль з 25 краін. Яны прывозілі лекі, медыцынскае абсталяванне, адзенне, ежу для забруджаных раёнаў Беларусі. Тысячы дзяцей прайшлі лячэнне за межамі Беларусі, а ў 1991 годзе 120 нашых дзяцей былі запрошаны на Міжнародны скаўцкі фестываль у Паўднёвую Карэю.

21 сакавіка г. г. у Палацы дзяцей і юнацтва па вул. Кірава адбудзецца ўстаноўчы сойм Згуртавання скаўтаў Рэспублікі Беларусь. На ўстаноўчы сойм запрошаны вядомыя беларускія пісьменнікі, грамадскія дзеячы, настаўнікі, прэса, радыё і тэлебачанне, а таксама скаўты з абласцей, гарадоў і вёсак нашай Беларусі.

Людзі, якія зацікаўлены ў рабоце з моладдзю ў пазашкольны час, павінны прыняць удзел у падрыхтоўцы і паспяховым правядзенні ўстаноўчага сойму скаўтаў Беларусі. Многія, хто прачытае гэты артыкул, змогуць выказаць пісьмова свае прапановы, заўвагі, падаць цікавыя і змястоўныя ідэі па пытаннях адраджэння 70-гадовых традыцый Крывіцкіх скаўтаў.

В. АКІМАЎ,
член арганізацыйнага камітэта ўстаноўчага сойму Згуртавання скаўтаў Рэспублікі Беларусь.

ВОЗГАЛАС РОЗГАЛАС

МАЎЧАЦЬ ТЭЛЕФОНЫ. ВІНАВАТЫ... ПАЦУКІ

АСІПОВІЧЫ. Есці хочуць усе — гэта неаспрэчна. У тым ліку і пацукі. Але і ім апошнім часам многа не перападае, вось і даводзіцца грызунам мяняць сваё «меню». У прыватнасці ў яго трапіла тэлефонная праводка па вуліцы Сумчанкі. У выніку — маўчаць звыш ста тэлефонаў. Сувязісты прыкладаюць усе намаганні, каб выправіць становішча. Такое і раней здаралася. Менавіта з-за гэтага не так даўно не працавалі тэлефоны і па вуліцах Дзмітрыева і Крыловіча.

ДАБРАЧЫННАЯ МІСІЯ ДЖЫМА КЕЙЗЕРА

АНТАРЫО—ПІНСК. Па такім маршруце падарожнічаў уладальнік аптэчнага магазіна з канадскага штата Антарыо Дж. Кейзер.

А перадгісторыя гэтага незвычайнага падарожжа такая. Мінулым летам у Канадзе на аздараўленні пабывала група пінскіх дзяцей. Яны жылі ў сем'ях мясцовых жыхароў. Муж і жонка Кейзеры ўзялі тады да сябе Лёню Пажывілку і Юлю Мартынюк і клапаціліся аб іх гэтак жа, як і аб сваіх трох дзецях.

Пасля ад'езду на радзіму юныя пінчане і іх бацькі перапісваліся з новымі знаёмымі, дзяліліся навінамі. І вось радасны сюрпрыз: сам Джым Кейзер завітаў у госці. За свой кошт ён здзейсніў такую дарагую паездку, прывёз Лёню і Юлі прадукты, вітаміны.

А заадно — і 14-тонны кантэйнер з лекамі і медабсталяваннем, сабранымі мясцовай хрысціянскай абшчынай для дзіцячых бальніц Пінска і Мазыра. На развітанне Дж. Кейзер паведаміў, што іх дабрачынная арганізацыя сёлета прыме на аздараўленне 70 беларускіх дзяцей з чарнобыльскай зоны.

ПАВЫШАЮЦЬ КВАЛІФІКАЦЫЮ

Час мяняе ўсё. А надыход рынку ставіць новыя патрабаванні літаральна да кожнага. Бо галоўнае сёння ў нашай краіне — змена самога чалавека, яго ўнутранага стану, поглядаў. Мяняюцца і патрабаванні да яго. Каб выжыць у віры сучаснага жыцця, трэба ўвесь час працаваць над сабой.

Менавіта з гэтай мэтай з'ехаліся на курсы павышэння кваліфікацыі ў Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў РБ галоўныя спецыялісты Міністэрства фінансаў рэспублікі і абласных фінансавых упраўленняў.

Тут яны вывучаюць сутнасць, мэты і функцыі рыначнай эканомікі, маркетынг, Кодэкс рэспублікі аб зямлі, іншыя заканадаўчыя акты. Не забываюць і пра тое, што сучасны кіраўнік і ўпраўленец павінны звяртаць асаблівую ўвагу на сваю культуру і ў рабоце ўлічваць такі важны момант узаемаадносін людзей, як псіхалагічны.

Работа заслугоўвае падтрымкі... грашовай

ЛІДА (А. Дук). На падставе пастановы ўрада РБ дырэктар музычнага вучылішча М. Баяровіч распарадзіўся павялічыць на 10 працэнтаў заработак выкладчыкам, якія вядуць педагагічную і выхаваўчую работу на беларускай мове. Ужо з гэтага месяца надбаўку атрымаюць амаль 30 выкладчыкаў. Такім чынам, яны не толькі маральна, але і матэрыяльна зацікаўлены ў адраджэнні роднай мовы. Дададзім, што ў музвучылішчы дакументацыя, нагляднасць, усе мерапрыемствы вядуцца на беларускай мове, плённа працуе пярвічная арганізацыя ТБМ імя Ф. Скарыны.

ПРАСВІДРУЕМ ШАР ЗЯМНЫ...

НАВАГРУДСКІ РАЁН **(В. Пятровіч).** Па ўсім відаць, справа ідзе да таго, што можа востра паўстаць пытанне аб чыстай вадзе для бытавых патрэб. Тую, што бяруць у калодзежах, практычна ўжо нельга ўжываць для піцця і гатавання ежы. У вёсцы Ігнатава давялося свідраваць артэзіянскую шчыліну на глыбіню ажно 150 метраў: водны гарызонт, размешчаны бліжэй да паверхні, забруджаны нітратамі і нітрытамі. Вось такі вынік гаспадарчай дзейнасці на калгасных палях.

Таўкучка не спіць. Але не спіць і міліцыя

Нямоўчным гулам, нейкім асаблівым гоманам гудзе нядзельны рэчавы рынак на стадыёне «Дынама» ў Мінску. Хтосьці прапануе зусім новыя імпартныя рэчы, хтосьці вырабы саматужнага промыслу, адны — паношаныя рэчы, другія — вырабленыя на нашых айчынных прадпрыемствах. Чаго там толькі няма! Тысяч восем-дзесяць народу.

На жаль, сярод сумленна гандлюючых сустракаецца, напэўна, і кватэрны злодзей, і рабаўнік, і зрывальнік шапак. Кожны з іх стараецца хутчэй збыць украдзенае. Не проста такіх распазнаць.

...Не прайшло і паўгадзіны, а да «Рафіка», за рулём якога малодшы інспектар аператыўна-пошукавага аддзела старшына міліцыі Н. Хмурко, малодшыя інспектары АПА аддзела па чарзе вядуць аднаго з сумкай джынсаў, другога з пясцовымі шкуркамі, трэцяга з «дыпламатам», у якім штосьці звініць.

— Трэцюю нядзелю запар «адпачываем» на рынку, — гаворыць начальнік аддзялення Ленінскага РАУС маёр міліцыі Аляксандр Міхайлавіч Цішкавец.

На рынак вядуць сляды спекуляцыі, крадзяжоў і іншых злачынстваў. Вось чаму «таўкучка» ў аддзялення на асаблівым рахунку, пад няспынным кантролем.

Аднойчы старшы оперупаўнаважаны АПА А. Гіро звярнуў ўвагу на маладога мужчыну, які прадаваў аправы для акуляраў. Каб апраў тых было адна-дзве, магчыма, і не ўзнікла б падазрэння. А тут — цэлая сумка, і ўсе новенькія, усе па 80 рублёў.

— А чые гэта вырабы? Падобна, замежныя? — пачаў з жарту старшы лейтэнант міліцыі.

— Ды якія там замежныя!— адказаў малады прадавец.

У пакоі міліцыі, куды быў дастаўлены прадавец, ён прызнаўся, што ўсе аправы купіў ў магазіне «Оптыка» па 25 рублёў. А ад перапродажу на рынку зарабіў 1.485 рублёў. І такіх прыкладаў нямала.

Аднак вернемся да рэйду, з якога пачалі расказ. Што ён даў?

Да абеду ў пакоі міліцыі набралася куча тавару, канфіскаванага ў спекулянтаў. Заўтра іх уладальнікі разам з супрацоўнікамі міліцыі адправяцца ў камісійны магазін, дзе ўсё будзе ацэнена па сапраўднаму кошту.

Ну а цяпер ідзе высвятленне, і затрыманыя выкручваюцца, крывадушнічаюць, льюць «кракадзілавы слёзы».

— Што ў «дыпламаце»? — ва ўпор спытаў Гіро ў мужчыны.

— Ды так... пракладкі. Сам зрабіў. Я на заводзе працую. А што, нельга? — абараняецца той.

— А метал, загатоўкі дзе ўзялі? І чаму трайную цану просіце?

Гэты, відаць, першы раз паспрабаваў барышнічаць. А вось грамадзянка з паношаным чамаданам, у якім шэсць пар мужчынскіх новых зімовых ботаў, відаць, з вопытных.

— Муж у мяне шавец, на рамонце сядзіць — ці многа ў майстэрні заробіш? Вось і шые... Я за сваю цану, не больш за дзяржаўную... Рынак цану ведае, — завучана тараторыць яна.

— А адкуль на падэшве размер абутку? У мужа што, асабістае кляймо ёсць? — «ловіць» Гіро спекулянтку. Ён заве з суседняга пакоя Вінаградава — ці не вызначыць той, якой фабрыкі вырабы.

— Ды гэта нашы, бабруйскія. Па фасону і футры відаць, — гаворыць Вінаградаў.

Праз некаторы час чуецца тэлефонны званок. Дакладвае малодшы інспектар АПА старшына міліцыі Дзешаў:

— На Камароўскім рынку ўзяты пры збыце пяці назваў залатых вырабаў два маладыя хлопцы, якія падазраюцца ў кватэрным крадзяжы. А аператыўна-пошукавая група малодшага інспектара Зарожнага пры збыце наркатычных сродкаў затрымала траіх каўказцаў, у якіх канфіскавана 30 грамаў марыхуаны і 100 долараў ЗША.

Ужо на наступны дзень у аператыўна-пошукавым аддзеле падвядуць вынікі рэйду. Па шэрагу фактаў спекуляцыі ў РАУС будуць узбуджаны крымінальныя справы.

В. ІЛЬЯНКОЎ,
начальнік аддзела УУС Мінгарвыканкома, палкоўнік міліцыі.

ЗАМЕЖЖА

Сільвестр СТАЛОНЕ: У АМЕРЫЦЫ НЕ ХАПАЕ ПАРАДКУ

Амерыканскаму кінаакцёру Сільвестру СТАЛОНЕ-супермену з нашумеўшых ва ўсім свеце баевікоў серыі «Рокі» і «Рэмба» ўручана адна з самых прэстыжных кінапрэмій «Ганаровы Цэзар».

Кароткае знаходжанне ў Парыжы ён выкарыстаў для прадстаўлення свайго новага фільма «Стой, а то мая мама будзе страляць!», які выходзіць на экраны ў красавіку. Прапануем увазе чытачоў інтэрв'ю Сільвестра Сталоне французскай газеце «Фігаро».

— Ці было для вас некаторай нечаканасцю ўручэнне «Ганаровага Цэзара»?

— Гэта ўзнагарода саграе мне сэрца, у сябе дома я не збалаваны такімі пашанамі.

— У 80-я гады «Рэмба» і «Рокі» сімвалізавалі герояў стылю «а ля Рэйган». Ці не з'яўляюцца яны сёння некалькі ўстарэлымі, «патрапанымі» героямі?

— Што датычыцца Рокі, то я згодзен, што яго час сапраўды мінуў. Рэмба, наадварот, сёння, як ніколі, актуальны. Я мару стварыць у хуткім часе новага Рэмба, які з такой жа страсцю, як і я, будзе абараняць экалогію.

— Вы — сябар Рэйгана. Якое пачуццё — энтузіязм ці абыякавасць—выклікаюць у вас маючыя адбыцца ў лістападзе прэзідэнцкія выбары ў ЗША?

— Ох ужо гэта палітыка! Прыкра, што краіна з амаль 300-мільённым насельніцтвам выстаўляе такіх кандыдатаў! Можна меркаваць, што ў Буша ёсць усе шанцы для перавыбрання на другі тэрмін. Што да яго саперніка Б'юкенена, то мне імпануюць яго ідэі наконт навядзення парадку. Парадак у доме — гэта якраз тое, чаго нам так не хапае ў Амерыцы!

— Ці не цяжка вам жыць у абліччы гэткага абмежаванага асілка?

— Гледзячы на мае моцныя біцэпсы, сапраўды можна думаць, што з інтэлектам у мяне даволі напружана — дурны стэрэатып, нічога не зробіш. Аднак мяне гэта зусім не хвалюе. Я добра ведаю, чаго варты, і не прэтэндую ні на што іншае, акрамя задавальнення маіх літаратурных і мастацкіх схільнасцей.

— Вам падабаецца літаратурная творчасць?

— Я напісаў дваццаць пяць сцэнарыяў і два раманы. Занятак гэты вельмі цяжкі. Калі выступаеш як акцёр, то часцей за ўсё карыстаешся словамі, напісанымі іншымі. Літаратурная ж творчасць прымушае цябе процістаяць сваім уласным страхам, трывогам і паражэнням. Сам-насам з белым аркушам паперы я адчуваю сябе асабліва неабароненым...

— Хто ваш любімы пісьменнік?

— Мне вельмі падабаецца Эдгар По. Я перачытаў усе яго творы. Пра яго, як і пра мяне, бытуе няправільнае ўяўленне. Яго ж лічаць наркаманам, вар'ятам, алкаголікам, у той час як ён быў перш за ўсё спартсменам, чэмпіёнам штата Вірджынія па бар'ернаму бегу. Я маю намер напісаць біяграфію Эдгара По, у якой пастараюся аднавіць справядлівасць.

— Якое месца ў вашым жыцці займаюць жывапіс і скульптура?

— Для мяне гэта лепшы спосаб аднавіць сілы і душэўны спакой, гэта мой асабісты метад псіханалізу. Я працую перш за ўсё ў рэалістычнай выяўленчай манеры.

— Вы вельмі багатыя. Вы калекцыніруеце творы мастацтва, самыя шыкоўныя аўтамабілі — «ролс-ройсы», «поршэ», «ферары». Для вас гэта сімвал поспеху?

— Зусім не. Поспех — панняце ілюзорнае. Я жыву ў абсалютнай адзіноце. Я ганяюся за шчасцем, але ніяк не магу дагнаць яго!

У ГРЭЦЫІ ЁСЦЬ НАВАТ ЧЭРГІ

АФІНЫ. Чэргі, аказваецца, ёсць не толькі ў нас. Як паведамляе фінская газета «Неа», кожны год у Грэцыі страчваецца каля 30 млн. рабочых гадзін з-за... чэргаў у банках. Паводле даных спецыялістаў, эканамічны ўрон з-за гэтага складае штогод звыш 50 млрд. драхмаў.

Газета тлумачыць такую незвычайную для капіталістычнай краіны з'яву дрэннай аснашчанасцю грэчаскіх банкаў сучаснай камп'ютэрнай тэхнікай і хранічнай няхваткай персаналу. З-за гэтага практычна ва ўсіх фінансавых установах Грэцыі штодзённа натоўпы людзей доўга прастойваць, каб здаць ці атрымаць грошы. На шчасце для жыхароў гэтай краіны, чэргаў тут, акрамя як у банках, нідзе больш няма.

СНІД КАШАЧЫ НЕ КУСАЧЫ!

ВІНДХУК. Амаль дзве трэці львоў у нацыянальным парку Кругера на ўсходзе ПАР — носьбіты разнавіднасці віруса СНІД, уласцівай для сямейства кашачых. Станоўчымі аказаліся 64 працэнты проб крыві, узятых у тутэйшых цароў звяроў. Дарэчы, «кашачы СНІД» у ПАР паразіў 14 працэнтаў свойскіх кошак.

Як піша йаханесбургская газета «Стар», спецыялісты мяркуюць, што вірус перадаецца жывёлінамі адзін аднаму пры ўкусах і нанясенні кіпцюрамі драпін. Яны не бачаць небяспекі яго распаўсюджвання на людзей.

Больш таго, ёсць меркаванне, што ў ільвоў развіўся імунітэт да віруса сіндрома набытага імунадэфіцыту, паколькі звяры выдатна сябе адчуваюць, ніхто з іх не памірае ў выніку хваробы.

На СНІД у парку Кругера былі праверены таксама гепарды і леапарды. Вынік цалкам адмоўны. Не знойдзена яго носьбітаў і сярод ільвоў у нацыянальным парку Эташа на поўначы Намібіі. Вучоныя б'юцца цяпер над праблемай, хто заразіў ільвоў СНІДам.

А ТУАЛЕТ БЫЎ ЗАНЯТЫ...

ДЭЛІ. Рэакцыя і самавалоданне захавалі жыццё і прынеслі славу 32-гадоваму Ракешу — жыхару індыйскага горада Катак. Зайшоўшы раніцай у туалет у двары дома, ён нос у нос сутыкнуўся з зусім дарослай і агрэсіўна настроенай пантэрай. Драпежнік атакаваў, але чалавек аказаўся больш спрытным. Толькі злёгку закрануты лапай звера, ён выскачыў і зачыніў дзверы. На шчасце, шпінгалеты ў Індыі дастаткова масіўныя. Тэрмінова прыбыўшыя работнікі мясцовага заапарку загналі прышэльца ў клетку. Для іх гэта — нечаканы набытак. Жывёліна трапіла ў горад уначы з навакольных лясоў. Але выбар месца для дзённага адпачынку аказаўся не самым удалым.

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

ЦЯЖАРНАЯ ЗАБОЙЦА

Пасварылася са сваім сужыцелем 20-гадовая маладая жанчына, якая цяпер знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску. Калі вычарпала ўвесь запас непрыстойных слоў, узялася за больш важкі «аргумент» — нож. З пранікальным нажавым раненнем у жывот 27-гадовы мужчына дастаўлены ў бальніцу. Рана, на шчасце, аказалася не вельмі небяспечнай: пацярпеўшы пасля агляду ўрача з бальніцы ўцёк. Дзіўныя парадоксы нашага часу: жанчына, якая рыхтуецца падарыць свету новае жыццё, гатова забраць яго ў іншага чалавека..

ДАЦЭНТ У РОЛІ ДАМУШНІКА

ПІНСК. У свой час ганарыліся жыхары вёскі Хойна сваім земляком — Станіславам Анцімонікам. І на тое былі важкія падставы: бліскуча скончыў мясцовую школу, гідрамеліярацыйны тэхнікум, паступіў у сельскагаспадарчую акадэмію. Там заўважылі здольнага хлопца — пакінулі ў аспірантуры. Пасля абароны дысертацыі стаў кандыдатам тэхнічных навук, дацэнтам. Прыняў пасаду старшага выкладчыка.

На жаль, хуткая кар'ера ўскружыла галаву маладому вучонаму. Стаў ён без меры банкетаваць. І неўзабаве калегі са шкадаваннем канстатавалі, што іх узыходзячая навуковая зорка — хранічны алкаголік. Давялося развітацца з ім.

А дацэнт апускаўся ўсё ніжэй і ніжэй, пакуль не ператварыўся ў гора-дамушніка. Некалькі крадзяжоў у Пінску прайшлі паспяхова. А вось апошні паклаў канец яго зладзейскай кар'еры. Гаспадыня кватэры застукала Анцімоніка з двума важкімі сумкамі яе хатняга скарбу. З дапамогай суседзяў быў затрыманы. Цяпер дацэнта чакаюць 2,5 года калоніі ўзмоцненага рэжыму.

ХЛОПЧЫК, АДДАЙ КАНТРАБАНДУ

БРЭСТ **(Ю. Фёдарава).** З трывожнай і унікальнай з'явай маюць справу мытнікі: у аўтобусах, якія вязуць за мяжу школьнікаў-турыстаў, правозіцца столькі ж кантрабанды, колькі і ў аўтобусах з дарослымі. Мытняй «Заходні Буг» накіраваны афіцыйныя прадстаўленні кіраўнікам аддзелаў адукацыі шэрагу абласцей Расіі і Беларусі. Супрацоўнікі прыгранічных службаў просяць стрымаць рост камерцыйнага турызму напярэдадні веснавых школьных канікулаў.

КАЛІ ЎЖО ВАХЦЁРА ДУРАЦЬ...

Недарэчны выпадак адбыўся ў корпусе Мінскага медыцынскага інстытута па вуліцы Ленінградскай. Нехта злаўчыўся выкрасці асабістыя рэчы... вахцёра ў яе стале.

Праблема крадзяжоў у студэнцкім асяроддзі існуе і, на жаль, прыносіць нямала клопатаў міліцыі.

І Ў НАС ЁСЦЬ ШТО КРАСЦІ ІНШАЗЕМЦАМ

Моцна былі здзіўлены супрацоўнікі крымінальнага вышуку Фрунзенскага РАУС, якія раскрылі кватэрны крадзеж у адным з дамоў па праспекту Пушкіна, учынены 2 сакавіка. Дамушнікам аказаўся... грамадзянін Рэспублікі Польшча 29-гадовы С., які з 27 лютага знаходзіўся ў турпаездцы па краінах СНД. Выкрадзены ім дыван вернуты законнаму ўладальніку, злачынца з замежным пашпартам змешчаны ў ІЧУ. У яго будзе магчымасць ацаніць сілу закона Рэспублікі Беларусь.

БОЙЦЕСЯ ЗЛАДЗЕЯЎ

БРЭСТ. Рост кватэрных краж, угон аўтамашын... Процістаяць гэтаму ў горадзе будуць імкнуцца не толькі праваахоўныя органы, але і камерцыйныя структуры. Створана сумеснае прадпрыемства, спецыялізаванае па выпуску сістэм ахоўных сігналізацый для жылых і вытворчых будынкаў.

Будуць вырабляцца таксама «сакрэтныя замкі» на аўтамабілі.

НА ДВОР'Е

12 сакавіка

Сёння ўдзень па рэспубліцы воблачнае з праясненнямі надвор'е, кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў Віцебску —3—5, Мінску і Магілёве — 4—6, Гродна і Гомелі — 5—7, Брэсце — 6—8 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак невялікія ападкі, моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы ад 1 градуса марозу да 4-х цяпла, удзень — 2—7 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

СУСТРЭЧА З ЗЕМЛЯКАМІ

«Усе мы — дзеці беларускай зямлі. Нашы сэрцы і душы заўсёды з вамі!» — гэтымі словамі закончылася прэс-канферэнцыя дэлегацыі Беларускай аўтакефальнай царквы напярэдадні яе вяртання ў Амерыку. У час двухтыднёвага візіту госці сустрэліся з грамадскасцю і вучонымі, прадстаўнікамі Беларускай праваслаўнай царквы, прачыталі цыкл лекцый перад будучымі маладымі бізнесменамі.

Падводзячы вынікі знаходжання ў Беларусі, удзельнікі канферэнцыі адзначылі, што намечана праграма канкрэтнай дапамогі рэспубліцы, пацярпеўшай ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Кіраўнік дэлегацыі мітрапаліт Мікалай заявіў журналістам, што гэтым візітам пакладзены добры пачатак кантактаў паміж беларусамі, якія жывуць у рэспубліцы, і беларусамі-эмігрантамі.

(Кар. БЕЛТА).

ШОУ ТОМА СОЕРА

Каля шасцідзесяці хлопчыкаў 9—10 гадоў прынялі ўдзел у адборачным туры шоу-конкурсу будучых джэнтльменаў «Шукаем Тома Соера», які праводзіць Рэспубліканскі палац прафсаюзаў.

Гэта ўжо другое падобнае мерапрыемства для юных мінчан. У мінулым годзе тут з поспехам прайшоў конкурс «Міс малютка».

Фінал цяперашняга конкурсу, які прадоўжаць дзесяць кандыдатаў, адбудзецца ў красавіку. Арганізатары рыхтуюць яго ўдзельнікам шмат сюрпрызаў, а гледачам абяцаюць цікавую праграму, як і належыць ва ўсялякім шоу.

ПЯЦІЗОРКАВЫ ІНТЭРНАТ—МІФ, ЦІ «СВЕТЛАЯ» БУДУЧЫНЯ

Апошнім часам на старонках газет з'явілася інфармацыя аб дакументах, якія Міністэрства адукацыі накіравала ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і якія, па меркаванню ўсё тых жа кампетэнтных крыніц, з'яўляюцца канчатковымі. Гаворка аб будучыні студэнцкіх інтэрнатаў. «З хворай галавы на студэнцкую», «Шыкоўна будзеш жыць, студэнт» — па загалоўках адразу відаць, што размова ідзе аб «абароне» бедных студэнтаў, якіх (крыху забягаем уперад) Міністэрства адукацыі хоча выкінуць на вуліцу. Згадзіцеся, што 8 рублёў, якія прыйдзецца кожны дзень плаціць студэнту за ложак у пакоі, для яго кішэні цяжар вялікі. Мы вырашылі сустрэцца з галоўным інспектарам упраўлення арганізацыі выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Уладзімірам КЛЯМЯТАМ.

— Уладзімір Фёдаравіч, папершае, сапраўды існуе дакумент, які ўжо вырашыў лёс студэнцкіх інтэрнатаў?

— Адразу скажу — не. Так, ёсць праекты, якія мы накіравалі ў ВНУ, упраўленні народнай адукацыі аблвыканкомаў і кіраўнікам усіх падведамных арганізацый. Але ж трэба разумець, што гэта толькі праекты, якія будуць абмяркоўваць, рабіць заўвагі і, нарэшце, дадуць заключэнне. Дарэчы, пачалі ўжо прыходзіць лісты, у якіх праект характарызуецца станоўча. Але канчатковага дакумента пакуль што няма.

Так, мы плануем павысіць плату за пражыванне ў інтэрнатах, таму што сродкі, выдзяляемыя з бюджэту, не пакрываюць страт. Але галоўнае заключаецца ў тым, што, калі навучэнец адарве свае грошы, будзе аплачваць пражыванне ў гасцініцы са сваёй кішэні, то ў яго павысіцца і адказнасць за стан гэтага жылля. Сёння ён плаціць 1.50 у месяц. Гэта плата ўстаноўлена яшчэ напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

— А вам не здаецца, што, перш чым браць «вялікія» грошы са студэнтаў за пражыванне ў інтэрнатах-гасцініцах, трэба давесці іх да належнага ладу?

— Так, мы за тое, каб пераходзіць да гасцініц паступова. Найперш адміністрацыя павінна зрабіць бягучы рамонт. Пасля таго як адбудзецца накапленне сродкаў і пакоі папоўняцца мэбляй, пачне і разрад інтэрнатаў-гасцініц узнімацца.

— Уладзімір Фёдаравіч, раней паведамлялася, што студэнтам прыйдзецца штомесяц плаціць за гасцініцу амаль 250 рублёў. Такая лічба не здаецца вам занадта «кусачай»?

— Мне хочацца расчараваць аматараў сенсацый: такіх грошай мы «драць» не збіраемся. У праекце абгаворана, што плата будзе недзе 60—90 рублёў у месяц. Згадзіцеся — у наш час гэта грошы сімвалічныя.

— Але і вы згадзіцеся, што ёсць катэгорыя студэнтаў, для якіх і гэта сума — праблема.

— Мы і пра гэта думалі. Безумоўна, будуць студэнты з малазабяспечаных сем'яў, дзеці-сіроты. Для іх прадугледжваюцца льготныя інтэрнаты.

— А не атрымаецца так, што ім будуць выдзяляцца горшыя пакоі?

— Не. Будуць жыць у такіх як і астатнія: пераход на гасцініцы мы ажыццявім не адразу. Гэта не год, не два. Працэс расцягнецца на доўгі час.

Гутарыў Ігар ШЧУЧЭНКА.

У час штогадовых «Фестываляў Карла Мая» ў Адкрытым тэатры гарадка Бад Зэгеберг у Паўночнай Германіі на працягу многіх гадоў ролю Вінету іграў французскі акцёр П'ер Брыс. Вінету, правадыр апачаў, — галоўны герой прыгодніцкіх раманаў саксонскага пісьменніка, кнігі якога перакладзены на 30 моў і дасягнулі агульнага сусветнага тыражу ў 80 мільёнаў экземпляраў. Карл Май зачараваў многія пакаленні маладых чытачоў. Але толькі пасля таго, як ужо ў пажылым узросце ён набыў вядомасць і грошы, змог Карл Май наведаць тыя краіны і кантыненты, дзе разыгрываюцца народжаныя яго фантазіяй гісторыі.

Фота ДПА.

ЧАМУ ЗВАР'ЯЦЕЛІ ЦЯЛУШКІ?

ПАРЫЖ. Вось ужо некалькі месяцаў невялічкая французская вёсачка Шандзье, што ў дэпартаменце Луара, знаходзіцца ў асадным становішчы: дзве здзічэлыя каровы, што збеглі са статка аднаго мясцовага фермера, блукаюць па акрузе, часам робячы набегі ў вёску ў пошуку ежы. Нягледзячы на намаганні паліцыі, жандараў і найбольш смелых мясцовых жыхароў, справіцца з імі няма ніякай магчымасці. Да «звар'яцелых кароў», як іх тут называюць, ніхто не асмельваецца падысці бліжэй чым на 30 метраў, бо неадкладна пачынаецца атака ў адказ.

Грамадзяне Шандзье не могуць зразумець: як жа так здарылася, што каровы — мірныя свойскія жывёлы — выбралі вольнае, дзікае жыццё на прыродзе? Адказ просты. Як растлумачыў былы ўладальнік кароў, гэтыя дзве «звар'яцелыя» — двухгадовыя цялушкі, «не знаёмыя» пакуль што ні з адным быком. У гэтым, маўляў, уся прычына іх некіруемасці.

МАХНЁМ НЯГЛЕДЗЯЧЫ

АТАВА. Канадскі выдавец П'ер Рэнаі разважае ў гэтыя дні над цікавай, але вельмі незвычайнай праблемай: колькі кніг варта аддаць за рэактыўны знішчальнік «МІГ».

Бізнесмены з былога Савецкага Саюза і ўсходнееўрапейскіх краін практыку бартэрных здзелак, што замацавалася ў іх на радзіме, узмоцнена спрабуюць распаўсюдзіць і на заходні свет, уключаючы Канаду. Прапанова абмяняць знішчальнік «МІГ» (праўда, без зброі) на слоўнікі і дзіцячыя кнігі паступіла ў адрас Рэнаі ад аднаго польскага гандляра.

Гэта не адзіная экзатычная прапанова, што прыйшла з Усходу.

Рэнаі, румын па паходжанню, спачатку не хацеў уцягвацца ў бартэрныя абмены, але ўрэшце не ўстаяў. Як ён паведаміў, хутка будзе заключана здзелка аб пастаўцы на Украіну паўмільёна кніг за драўніну, якая неабходна ў Венгрыі. Там яе абмяняюць на мяса і вывезуць яго ў Польшчу, а выручаныя польскія злотыя ўжо можна перавесці ў долары. Для рэалізацыі гэтай шматхадовай камбінацыі Рэнаі прыйшлося стварыць асобную кампанію.

РУСКІЯ ІДУЦЬ... «НАПАРСТАЧНІКІ»

ПРАГА. Сярод белага дня на ажыўленай вуліцы ў цэнтры Прагі выстраламі ва ўпор быў забіты «напарстачнік» з Расіі. Сведкі паказалі, што прыкладна ў 3 гадзіны дня да трох рускіх «напарстачнікаў», якія займаліся тут забароненай законам гульнёй, падышла група з 15 чалавек, узброеных жалезнымі палкамі і ланцугамі. У бойцы адзін з нападаўшых, апрануты ў маскіровачны камбінезон, раптам выхаціў пісталет і пяць разоў выстраліў. Кулі трапілі аднаму з «напарстачнікаў» у галаву, грудзі і нагу. Забойца і яго саўдзельнікі адразу ж зніклі.

Газета «Млада фронта днес» сцвярджае, што ўсе трое рускіх належаць да добра арганізаванай групы гангстэраў, якая кантралюе цэнтр Прагі.

«ЗАЛАТАЯ ЛІХАМАНКА» Ў ТАНЗАНІІ

НАЙРОБІ. Непадалёк ад танзанійскага горада Мванза, размешчанага на беразе возера Вікторыя, выяўлена вялікае радовішча золата, паведаміла радыё Дар-эс-Салама. Гэтыя звесткі пацверджаны адным з вядучых танзанійскіх геолагаў Бенедзіктам Мулці. Паводле яго слоў, першаадкрывальнікамі золата ў гэтым раёне з'яўляюцца жыхары вёскі Манду, якім будзе дадзены прыярытэт у атрыманні ліцэнзіі на здабычу каштоўнага металу. Навіны аб новым радовішчы хутка распаўсюдзіліся па краіне, і ў гэты раён хлынуў паток старацеляў. У сувязі з гэтым Б. Мулці заявіў, што зямля ў раёне прыскаў належыць сялянам Манду, а таму неабходна мець ад іх дазвол на здабычу золата.

ЧАТЫРОХНОГАЕ ДЗІЦЯ

МАСЕРУ. Ён нарадзіўся пяць месяцаў назад у ПАР і неўзабаве стане такім жа, як яго равеснікі. У гэтым пераканаць хірургі з дзіцячай бальніцы Чырвонага Крыжа ў Кейптаўне, якія маюць намер у бліжэйшы час правесці унікальную аперацыю па ліквідацыі шматлікіх прыроджаных дэфектаў.

Верхняя частка цела дзіцяці, якога завуць Азіз Раілун, зусім нармальная. Аднак у хлопчыка два раздзельныя тазабедраныя суставы з палавымі органамі. Медыкі гавораць, што падобныя прыроджаныя анамаліі — вельмі рэдкая з'ява, мабыць адзін выпадак з мільярда. Першае хірургічнае ўмяшанне ўжо адбылося. У Азіза выдалена «лішняя» тоўстая кішка.

Бацькі хлопчыка — 22-гадовыя Ібрагім і Чаіру Раілун — зусім здаровыя людзі. Сярод іх сваякоў нікога не было з фізічнымі адхіленнямі.

Бацькі Азіза пайшлі на абнародаванне гэтай гісторыі толькі пасля таго, як зразумелі, што не ў стане самі аплаціць кошт аперацыі.

Па матэрыялах інфармацыйных агенцтваў і друку.



У час сустрэчы ў Беларусі міністраў абароны суверэнных дзяржаў адбыўся паказ ваеннай авіяцыйнай тэхнікі, далейшы лёс якой зноў будзе вырашацца на чарговай сустрэчы ў Кіеве.

НА ЗДЫМКУ: ракетаносец далёкага накіравання—бамбардзіроўшчык ТУ-22м3.

Фота Н. МАЛЫШАВА. (ІТАР—ТАСС).

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту У. Сычова

ПЕРШЫ КВАРТАЛЬНЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 3

Белыя: Крh6, Фg1, Лс8, Лh5, Са2, Сh4, Ке3, Кg6, п. f2 (9).

Чорныя: Крd4, Фd2, Ла6, Са7, Са8, Кb2, Кh3, пп: а5, с3, d3, d7, е4, f6 (13).

Мат за 2 хады.

Заданне № 4

Белыя: Крd6, Фh7, Лf1, Ке7, Кh3 (5).

Чорныя: Крg4, Сf3, Кg1, пп: е3, h2 (5).

Мат за 3 хады.

Для тых, хто яшчэ не ўключыўся ў спаборніцтва, паўтараем першыя заданні (двухходоўкі):

№ 1. Белыя: Крb4, Фh3, Ле5, Сb1, Сb8, пп: f3, g4 (7).

Чорныя: Крd4, Ле3, Сb3, Сg1 (4).

№ 2. Белыя: Крg8, Фh3, Лb1, Лf5, Сf1, Сf8, Кd3, пп: а3, а5 (9).

Чорныя: Кра4, Се3, Ке2, пп: d4, f2 (5).

Паспяшайцеся даслаць адказы ў рэдакцыю. Пажадана, каб рашэнні прысылаліся на паштоўках або ў канвертах з паметкай «Шахматы».

ЗВЕРЦЕ РАШЭННІ

Кампазіцыі, апублікаваныя ў нумарах газеты за 16 і 28 студзеня і за 5 лютага г. г., рашаюцца так:

М. Харкевіч. 1. Кре5!

Д. Канонік. 1. Сf8! Крd4, 2. Сg7, Крe4 3. С:h8 Крd4 4. Кр:f7+ Крe4 5. Крf6 Крe4 6. Кр:g6 Крe4 7. Крf6 Крd4 8. Крf5×

Я. Дзвізаў. 1. Ф:е6 h1Ф+ 2. Крb6! Фb7+! 3. Кр:b7 Фh1+ 4. Фс6! Фd5! 5. Крb6 Фе6 6. Кре5 Фd7 7. Крс5 Фс7 8. Крd5 Фd7 9. Крd6 і выйгрыш.

Я. Дзвізаў. 1. b4! Сс7+ 2. dс Лh8+ 3. сВК!+ Л:с8+ 4. Кр:с8 Фg8+ 5. Крd7 Ф:а8 6. с5+ Крb7 7. с6+ Крb8 8. а5 Ф:с6+ 9. Кр:с6 — нічыя, 2...Фg8+ 3. сВК!+ Ф:с8 4. Кр:с8 Лh8+ 5. Крd7 Л:а8 6. с5+ Крb7 7. с6+ Крb8 8. а5 і нічыя.

В. Ваўнейка і А. Петрусенка. 1. Фс3! 1. Фf2? b4! 1. К:h5? ef!

В. Зелянкоўскі. 1. Лd3! 1. Фа8? Кb7! 1. Фh7? С:g4!

Прагулкі з чарадзеем

Ён лічыць: любы з нас можа стаць марыянеткай у руках цёмных сіл

ЯЦВЁРДА ПЕРАКАНАНЫ, што настаў час сур'ёзна задумацца над стварэннем спецыяльнай службы псіхалагічнай і біяэнергетычнай абароны насельніцтва. Інакш чалавек застанецца бязбройным перад нарастаючай агрэсіяй цёмных, калі хочаце, дэманічных сіл.

Юрый Грышаеў адкідваецца на спінку крэсла, даючы зразумець, што ў гэтых дзвюх фразах ён сфармуляваў сваё сённяшняе светаразуменне і прапанаваў хоць нейкі выхад з сітуацыі.

Аднак адкуль у гэтага 48-гадовага адстаўнога афіцэра такія сапраўды сусветныя клопаты?

...«Я — адзін з многіх»,— сказаў Юрый Мікалаевіч яшчэ пры першай сустрэчы, але тады я адчуў у гэтым толькі правінцыяльную сціпласць. Пазней успомніў яго словы, і яны, прызнацца, не проста збянтэжылі мяне — нават некалькі занепакоілі. Але пра гэта ў свой час...

А пазнаёміліся мы з Юрыем Грышаевым у майстэрні аднаго маскоўскага скульптара. Тады ён здзівіў усіх нас, паведаміўшы мімаходзь аб хваробе чалавека, чый бюст гаспадар толькі што закончыў («Вы яго з любоўю ляпілі, растлумачыў ён, і вашы далоні міжволі перанеслі ў гліну энергетычны злепак арыгінала. Па ім я ўсё і «прачытаў», як па жывым целе).

Дыягназ, дарэчы, потым поўнасцю пацвердзіўся, а тады мы вырашылі яшчэ як-небудзь праверыць здольнасці нашага ці то чарадзея, ці то лекара— па нявопытнасці мы блыталіся ў адценнях. Аднаму з гасцей прыйшла ў галаву выдатная думка: няхай паспрабуе апісаць, як расстаўлена мэбля ў пакоях у яго дома.

Быў адказ: «Па-першае, у вас усяго адзін пакой...»

Пазней Юрый Мікалаевіч дэманстраваў і не такое. Скажам, пагутарыўшы з маім сябрам па тэлефоне аб нейкіх глупствах, дастаткова падрабязна расказаў аб хваробах і траўмах, якія той перанёс. Так што да гэтых штучак я хутка прывык. Як і яго сусед па гасцінічным нумары. Гаротнік, паслізнуўшыся, моцна пабіў руку, дык Грышаеў яго нават суцяшаць не стаў. «Дарэмна вы два дні назад пакрыўдзілі жанчыну». Той адно сумеўся.

Увогуле, апісваць усё гэта цяпер ужо неяк і не цікава. Аб экстрасенсорных здольнасцях, аб «сіле» таго ці іншага цудалекара цяпер нават бабулі на лаўках гавораць. Што іх цікавіць? Ну, скажам, як становяцца знахарамі.

Усё адбылося нечакана і будзённа. Запрасілі яго неяк у мужчынскую кампанію. Пакойчык маленькі — прысесці няма дзе. Вось адзін з гасцей і зрабіў шырокі жэст: «Сядай на маю нагу. Яна ўсё роўна ўжо тры гады як здранцвела». А праз паўгадзіны раптам адчуў у назе паколванне.

Далечвалі нагу ўжо дыпламаваныя ўрачы. Але выпадак гэты запаў у памяць і самому Грышаеву, і яго сябрам. За ім, дарэчы, і да таго сёе-тое заўважалася. У камандзіроўках, скажам, калегі заўсёды з ахвотай сяліліся з ім у адным пакоі: у ім неяк лягчэй дыхалася. Іанізуе паветра Грышаеў, як потым высветлілася. І наогул — шмат чаго незвычайнага з часам адкрылася ў ім.

Так што цяпер вы ведаеце, як у нас становяцца «простым савецкім знахарам». Але мяне, па праўдзе кажучы, больш за ўсё цікавіла вось што: якім бачыцца яму наша сённяшняе жыццё, што ён думае пра яго? Павінен жа быць у чарадзея нейкі свой погляд на тое, што адбываецца, ракурс які-небудзь нечаканы.

Мы гулялі па мокрай вулі-цы, гаварылі пра сёе-тое, а Юрый Мікалаевіч час ад часу няспешна штосьці збіраў пальцамі са свайго старога дэмісезоннага паліто і гідліва змахваў. Ці рабіў нейкі дзіўны, адрываючы жэст. Я ўжо ведаў: зноў прайшлі праз «бруд», «чарнату» — моцна заражанае нянавісцю, адчаем, болем месца.

Вось так мы і набліжаліся пакрысе да ідэі стварэння службы біяэнергетычнай абароны насельніцтва.

— Ды каб я пачаў гаварыць пра гэта некалькі гадоў назад— мяне палічылі б псіхам. А цяпер пра сурок ці насланнё многія гавораць, як пра нешта адчувальнае. Зразумела, я чуў разважанні аб тым, што ў містыку кідаюцца ў пераломныя, віражныя моманты гісторыі. А нам, лекарам, гэта, маўляў, толькі на руку. Але ж гаворка ідзе ў даным выпадку ні больш, ні менш як аб маральным здароўі нацыі! Мы шмат гаворым аб сацыяльнай абароне народа пры пераходзе да рынку. Але хіба абарона асобы, яе духоўнага свету і душэўнага спакою менш значная? А чалавек цяпер проста безабаронны перад агрэсіяй цёмных сіл. А вы думаеце, што так ужо складана навесці на нас насланнё?

Уласна кажучы, я да гэтага часу наогул пра гэта неяк не думаў. Але да разумення, няхай і павярхоўнага, сутнасці справы ўжо крыху наблізіўся. Мяне, напрыклад, вельмі зацікавіла тое, якім чынам ён дыягнаставаў майго сябра па тэлефоне. Грышаеў «цямніць» не стаў. Растлумачыў, што зляпіў з энергетычнага згустка фантом сябра і па ім праводзіў абследаванне.

— А энергія як сюды трапіла? — дапытваўся я.— Па правадах, ці што?

— Не ведаю,— паціснуў плячамі Грышаеў.— Я гутару з чалавекам і як бы настройваюся на яго. І пакрысе пачынаю адчуваць, што перада мной узнікае энергетычны згустак. Зблізкаю далоні (а гэта мой галоўны «інструмент») і ясна адчуваю яго пругкую падатлівасць. Затым пачынаю «ляпіць» фантом. Натуральна, гэта не нейкая копія чалавека — схема хутчэй. Але яна дае магчымасць вызначаць рукой-лакатарам хворы орган.

— Ну, добра. Гэта — дыягностыка. А лячыць на адлегласці — можна?

— Чаму ж. Вядома, я лічу за лепшае пасля завочнага абследавання сустрэцца з пацыентам. Тым больш, што часцей за ўсё стараюся лячыць траўкамі. Але ў некаторых выпадках можна на самім фантоме ўздзейнічаць на хворае месца, а потым накіраваць яго праз Космас «адрасату».

Я толькі рукамі развёў:

— Д'ябальшчына нейкая, прабачце...

А потым мне раптам прыйшла думка:

— Дазвольце. Але ж у такім разе фантом можна і заразіць нейкай хваробай і, пераслаўшы, як вы гаворыце, «адрасату», усяліць у яго хваробу?

Юрый Мікалаевіч стаў больш строгім:

— Гэта ўжо са сферы чорнай магіі. І гэта адна з магчымых форм замаху на асобу.

А задаў я такое пытанне вось чаму. Многім, напэўна, памятныя нашумеўшыя мінулагоднія гісторыі з «цэкоўцамі-скакунамі»: тры буйныя работнікі апарату ЦК КПСС (якія мелі, дарэчы, доступ да тайнаў партыйнай касы), быццам па змове ці па нечай камандзе, адзін за адным пакончылі рахункі з жыццём, выкінуўшыся з вокнаў уласных кватэр. Тады і з'явілася ў нашым лексіконе дзіўнае слоўца «зомбі»: усе яны быццам бы былі закадзіраваны нейкімі «суперэкстрасенсамі» на пэўнае слова, і дастаткова было сказаць яго ў самай бяскрыўднай размове, як спрацоўваў унутраны «пускальнік»: быццам хтосьці нацыскаў «чырвоную кнопку». Ці магчыма гэта?

— Так,— суха пацвердзіў Грышаеў, яўна не жадаючы працягваць гэту тэму.— І фантом тут можа выкарыстоўвацца ў якасці своеасаблівай міны запаволенага дзеяння. І наогул маніпуліраваць паводзінамі чалавека на адлегласці, прымушаць рабіць нейкія нечаканыя ўчынкі супраць волі — усё гэта, на жаль, не са страшных казак, а з нашага штодзённага жыцця. Як і рост колькасці «вампіраў», з якімі кожны з нас сутыкаецца пастаянна.

Ну з тым, што ўсе людзі больш ці менш выражана падзяляюцца на «вампіраў» і «донараў», я думаю, любы, падумаўшы, згодзіцца. На жыццёвым шляху кожнаму сустракаўся чалавек, да якога ногі самі нясуць у цяжкую хвіліну, каб выгаварыцца без утойвання, паплакацца, аблегчыць душу, зняць камень з сэрца і г. д. Ад такіх людзей ідзеш нейкім прасветленым, поўным сіл і ўпэўненасці ў сабе. Гэта і ёсць «донары», якія літаральна выпраменьваюць станоўчую біяэнергію,— «жыццёвую сілу», як гаворыцца.

А з другога боку: каму не прыходзілася гаварыць са злосцю ці хоць бы чуць надрыўнае: «Ён (яна) з мяне ўсе сокі выпіў (выпіла)!» Гэта ўжо аб «вампірах». Справа ў тым, што ўсе мы з'яўляемся носьбітамі пэўнага біяэнергетычнага заряду, які стварае адпаведнае поле. Так што і ўзаемаадносіны паміж людзьмі ў многім вызначаюцца ўзаемадзеяннем гэтых палёў. Адхіленні ў той ці іншы бок ад аптымальнага для данай асобы біяэнергетычнага ўзроўню дыктуе і яе паводзіны. Пры нястачы — імкненне «падзарадзіцца». Пры лішку — аддаць.

Дык вось: цяперашняе неўладкаванае, непрагназуемае, нервовае жыццё аб'ектыўна патрабуе павышанага расходу энергіі, адначасова не садзейнічаючы масаваму з'яўленню «шырокіх душ». Пры гэтым знижаецца і здольнасць падсілкоўваць сябе энергіяй Космасу: арганізму, забруджанаму злосцю, гэта ўжо не пад сілу. Адсюль і нарастанне «вампірызму» — большай часткай нават неўсвядомленае імкненне «адсмактаць» біяэнергію з акружаючых. І непазбежны вынік: усё больш з'яўляецца людзей агрэсіўных («вампіраў»), усё больш і заштурханых, з патухшымі вачамі, няўпэўненасцю ў словах і ўчынках («донары»).

— Веруючы чалавек заўсёды падсілкоўваўся біяэнергіяй у храмах Божых,— гаворыць Грышаеў.— Трэба сказаць, што і будаваліся гэтыя храмы ў тых месцах, на якія шчодрым патокам скіравана энергія Космасу,— гэта нашы продкі вельмі тонка адчувалі. Успомнім, што і качэўнік ставіў сваю юрту толькі там, дзе сама атара спыніцца на ноч. І зноў жа гэта было ў «пляме» нейкага энергетычнага «пражэктара». Так што — «чэрпайце сілы ў веры», як і раілі мудрацы.

РАСПРАЦАВАНЫ і нейкія практычныя парады. Скажам, выходзячы на вуліцу, нядрэнна «апрануць» абаронны «кокан». Робіцца гэта так. Патрыце далоні адна аб адну і злучыце іх над галавой. Затым павольна апускайце па баках тулава, стараючыся ўявіць (унушыць!), што вы заключаеце сябе ў нейкую абалонку, праз якую не зможа прабіцца агрэсіўнае поле. Пад канец «заглыбіце» яе на паўтара-два метры ў зямлю. Запэўніваю вас, гэта дапамагае вельмі многім...

Юрый ГОЛУБЕЎ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

12 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

15.20. «Людзі на балоце. Палеская хроніка». 3-я серыя «Лістапад».
16.30. Тэлебачанне — школе. Васіль Быкаў і яго аповесць «Знак бяды».
17.10. Мы такія розныя. Музычна-забаўляльная праграма.
18.00. Дак. фільмы
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гродна).
19.35. Зачытайце маё пісьмо...
19.40. Здароўе.
20.00. «Выспа Беларушчыны». Сустрэча з выкладчыкамі першага беларускага ліцэя.
20.25. Калыханка.
20.45. Тыдзень беларускага ўрада.
21.00. Крок. «Неір!» («Дапамажыце!»). Рок-канцэрт акцыі «Дзецям Чарнобыля». Частка 1-я.
22.05. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа.

І канал. Астанкіна

12.45. Л. Бернстайн. Сімфанічныя танцы з мюзікла «Вестсайдская гісторыя».
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. «Арэвік». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.30. «Ціха! Ідзе аперацыя». Мультфільм.
15.35. Выступленне Камчацкага камернага аркестра.
16.00. Фільм — дзецям. «Васьміногі з другога паверха». 1-я серыя.
17.00. Навіны.
17.25. ...Да 16 і старэйшым.
18.05. Дасье.
18.30. Фільмы рэжысёра Г. Данелі. «Я крочу па Маскве».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Ведзі».
21.40. Тэатральныя сустрэчы.
23.00. Навіны.
23.25. «Бізнес і дзеці». Дабрачынны канцэрт.

Канал «Расія»

11.40. Камера даследуе мінулае.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Пра бізнес і пра сябе.
15.10. «Цудоўнае імгненне». Калядная музыка з Кёльнскага сабора.
15.40. Дак. фільм.
16.15. Ключ да сусветнага рынку.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Трансрасэфір: «Далёкі Усход».
17.45. Вольны час. «Увага: здымаю!»
18.00. Парламенцкі веснік Расіі.
18.15. Студыя «Нотабена».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спецыяльны камерцыйны веснік.
19.40. «Свята Нептуна». Маст. фільм.
20.35. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.55. Прэзідэнт Татарстана М. Шаймііеў у прэс-цэнтры «Рэспубліка».
22.00. Весткі.
22.25. Мастацка-публіцыстычная праграма.

13 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Усмешка тэракоты». Кінанарыс.
9.00. Тэлебачанне — школе. Васіль Быкаў і яго аповесць «Знак бяды».
14.20. «Людзі на балоце. Палеская хроніка». 4-я серыя «Подых навальніцы».
15.30. Меркурый.
16.30. Юбілейны канцэрт музычнай школы № 10 г. Мінска.
17.30. «Асляня», «Дадабай і будзільнік», «Памочнік Гефеста». Мультфільмы.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Магілёў).
19.35. Наш каментарый. «Перасяленцы».
19.40. Гаспадар. Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Крок. «Неір!» («Дапамажыце!»). Рок-канцэрт акцыі «Дзецям Чарнобыля». Частка 2-я.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Фільм — дзецям. «Васьміногі з другога паверха». 1-я серыя.
8.35. ...Да 16 і старэйшым.
9.15. Дак. фільм.
9.45. Тэатральныя сустрэчы.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
12.20. Спорт для ўсіх.
12.50. Выступленне ўзбекскага фальклорнага ансамбля «Хіва накшлары».
13.20. Брыдж.
13.45. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
14.25. Музей на Дэлегацкай.
14.55. «Больш за 40 градусаў у цяні». Маст. фільм.
16.00. Вобраз.
17.00. Навіны.
17.25. Іграе В. Валівулін (гармонік).
17.40. Чалавек і закон.
18.20. «Мая сям'я і іншыя жывёлы». (Вялікабрытанія). 9-я серыя.
18.50. «Поле цудаў».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «ВІД» прадстаўляе: «Ток-шоу», «Музагляд».
22.20. Хакей. ЦСКА — «Спартак».
23.00. Навіны.
23.25. «ВІД» прадстаўляе: «Спорт», «Шоу-біржа», «Хіт-канвеер».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Англійская мова. 1-ы год навучання.
8.50. Вольны час. «Увага: здымаю!»
9.05. Англійская мова. 2-гі год навучання.
9.35. Прэзідэнт Татарстана М. Шаймііеў у прэс-цэнтры «Рэспубліка».
10.40. «Пятае кола».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Пра бізнес і пра сябе.
15.10. «Для вас спявае Міхаіл Навахіжын».
15.35. «Попел сноў».
16.15. «Прастора плюс».
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Трансрасэфір: «Еўропа—Азія».
17.45. «Версія».
18.00. «Дамашні клуб».
18.15. Палітдзел.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Сны пра Ізраіль». Фільм 2-гі.
20.15. Антракт.
20.25. На сесіі Вярхоўнага Савета Расіі.
20.50. «К-2» прадстаўляе... У перапынку — Весткі.

БЕЛАРУСКІ АКЦЫЯНЕРНЫ КАМЕРЦЫЙНЫ ПРАМЫСЛОВА-БУДАЎНІЧЫ БАНК

«БЕЛПРАМБУДБАНК»

27 САКАВІКА 1992 ГОДА НА СХОДЗЕ АКЦЫЯНЕРАЎ

падводзіць вынікі дзейнасці за мінулы год, намячае асноўныя напрамкі дзейнасці ў гэтым годзе.

У 1991 ГОДЗЕ БАНК ЗАРЭГІСТРАВАНЫ Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ БАНКУ ЯК АКЦЫЯНЕРНЫ І ВЫКУПІЎ АСНОЎНЫЯ ФОНДЫ І МАЁМАСЦЬ.

«Белпрамбудбанк» з'яўляецца універсальнай крэдытнай установай і праводзіць комплекснае абслугоўванне кліентуры, дэпазітныя, крэдытныя, касавыя, фактарынгавыя, лізінгавыя аперацыі, прыцягвае, размяшчае і кіруе каштоўнымі паперамі па даручэнню эмітэнтаў і інвестараў.

БАНК АКАЗВАЕ ЎВЕСЬ СПЕКТР ПАСЛУГ, ПРЫНЯТЫХ У МІЖНАРОДНАЙ БАНКАЎСКАЙ ПРАКТЫЦЫ: брокерскія, кансультацыйныя, інфармацыйныя, пасрэдніцкія, паслугі па страхаванню, выдачы гарантый і паручыцельстваў, правядзенне камерцыйнай экспертызы навукова-тэхнічных навацый і капітальных укладанняў.

Маючы генеральную ліцэнзію, «Белпрамбудбанк» вядзе балансавыя валютныя і карэспандэнцкія рахункі («Ностра» і «Лора»), праводзіць аперацыі па міжнародных разліках, звязаных з экспартам і імпартам, купляе і прадае замежныя валюты, прыцягвае і размяшчае сродкі ў замежнай валюце ў форме крэдытаў, дэпазітаў і ўкладаў, ажыццяўляе негандлёвыя аперацыі.

«Белпрамбудбанк» запрашае заснавальнікаў прыняць удзел у сходзе.

СХОД БУДЗЕ ПРАХОДЗІЦЬ ПА АДРАСУ: **МІНСК, БУЛЬВАР ЛУНАЧАРСКАГА, 4.**

ДАВЕДКІ ПА ТЭЛЕФОНАХ: 33-31-53, 33-23-77.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Адкрыццё дзевятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

«І зноў пікеты на плошчах». Патрабаванні работнікаў народнай адукацыі да ўрада.

«Шкада, што сенатары не прызямліліся». Няздзейснены візіт у Беларусь дэлегацыі амерыканскіх сенатараў.

З пошты аддзела **«Дзяржава і права».** Падборка.

Наш каментарый. **«Зарплата расце: ці стане больш тавараў?»**

Гісторыя аднаго махлярства. **«Ценю ад праўды не бывае».**

Чытач — чытачу. Падборка. **«Выратуйце іх душы».** Пра тых, хто займаецца сексуальным выхаваннем падлеткаў.

Маналог прыбіральшчыцы. **«Кансьержка сказала б «Фі»!**

Рэклама. Аб'явы.

ВЫКОНВАЕМ

рамонт аўтамабіляў, зварачныя работы, сталярныя вырабы,

АКАЗВАЕМ

транспартныя паслугі,

ЗАПРАШАЕМ

сталяроў,

РЫХТУЕМ

да здачы ў ДАІ правілаў дарожнага руху.

Тэлефон у Мінску 36-44-17.

Рамонтна-механічны завод «СЛАВЯНСКІ»

г. Славянск-на-Кубані

Рэалізуе па свабодных цэнах

СВАЮ ПРАДУКЦЫЮ ФЕРМЕРСКІМ ГАСПАДАРКАМ І НА ЎЗАЕМАВЫГАДНЫХ УМОВАХ—ІНШЫМ ПРАДПРЫЕМСТВАМ І ЎСТАНОВАМ:

- **Трактарныя прычэпы 2ПТС-4 мад. 887Б...** — 32.000 руб.
- **Трактарныя прычэпы ёмістасцю 45 кубаметраў** — 40.000 руб.
- **Перасовачныя дызельныя помпавыя станцыі СНП-75/100** — 163.840 руб.
- **Перасовачныя дызельныя электрастанцыі АДП-50 (магутнасць 50 кВт)** — 184.440 руб.
- **Перасовачныя дызельныя электрастанцыі АДП-60 (магутнасць 60 кВт)** — 212.480 руб.
- **Аўтапаілку ПА-1А (для буйной рагатай жывёлы)** — 122 руб.

ЦЭНЫ, ІСНУЮЧЫЯ НА 10 ЛЮТАГА 1992 ГОДА, ПРЫВЕДЗЕНЫ З УЛІКАМ ПАДАТКУ НА ДАБАЎЛЕНЫ КОШТ.

РМЗ «Славянскі» акрамя гэтага выробляе:

- **Люкі каналізацыйныя**
- **Задзвіжкі ДУ-80**
- **Прычэпы для легкавых аўтамабіляў.**
- **Ацяпляльныя катлы бытавыя.**

АПЛАТА ПРАДУКЦЫІ — ПАПЯРЭДНЯЯ, З НАСТУПНЫМ ПЕРАРАЗЛІКАМ ПА КОШТУ ФАКТЫЧНА АДГРУЖАНАЙ ПРАДУКЦЫІ.

МЫ З ПРЫХІЛЬНАСЦЮ РАЗГЛЕДЗІМ ЛЮБЫЯ ПРАПАНОВЫ.

НАШ АДРАС: 353840, г. Славянск-на-Кубані Краснадарскага краю, вул. Дружбы народаў, 13. РМЗ «Славянскі».

КАНТАКТНЫЯ ТЭЛЕФОНЫ: (8-861-46) — 2-28-95; 2-28-93.

ФАКС: 2-28-84, ТЭЛЕТАЙП 711211 «ПРИЦЕЛ».

Міждзяржаўная інфармацыйная камп'ютэрная сетка Акцыянернае таварыства «Інфармкамсетка» «ICS-91»

У АСОБЕ СВАЙГО ПРАДСТАЎНІКА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМЕРЦЫЙНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА

«ГРЭТА-Ф»

запрашае вас да супрацоўніцтва

Ў ПЫТАННЯХ ВЫРАШЭННЯ ПРАБЛЕМ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ВАШАГА ПРАДПРЫЕМСТВА СЫРАВІНАЙ І ЗБЫТУ ВАШАЙ ПРАДУКЦЫІ.

«ICS-91» — **камп'ютэрная сетка, у якую ўваходзяць інфармацыйныя цэнтры і прадстаўніцтвы, са сваімі абанентамі, размешчанымі ў Беларусі, Расіі, Казахстане, што забяспечыць вам доступ да сыравіны і тавараў гэтых дзяржаў.**

«ICS-91» — **гэта камп'ютэрная сетка двухбаковай перадачы тэкставай, таблічнай і графічнай інфармацыі, якая рэалізуе магчымасці звычайнай тэлефоннай лініі сувязі.**

СТАЎШЫ АБАНЕНТАМ СЕТКІ ВЫ ЗМОЖАЦЕ, НЕ ВЫХОДЗЯЧЫ З КАБІНЕТА:

◆ мець праз камп'ютэрныя сеткі сувязь з любым яе абанентам;

◆ аператыўна атрымліваць і апрацоўваць камерцыйную інфармацыю, якая ёсць у банках даных любога з інфармацыйных цэнтраў сеткі, забяспечыўшы тым самым магчымасць продажу, куплі або абмену разнастайных тавараў;

◆ перадаваць любую неабходную інфармацыю карэспандэнтам, якія знаходзяцца ў любым з гарадоў, у якім ёсць прадстаўніцтва сеткі (Мінск, Санкт-Пецярбург, Масква, Алма-Ата, Арэнбург, Ленінск (Байканур).

БАНК ДАНЫХ ІНФАРМАЦЫЙНАГА ЦЭНТРА ЎТРЫМЛІВАЕ

◆ біржавую інфармацыю аб маючых адбыцца таргах і выніках папярэдніх таргоў па ўсіх асноўных біржах Беларусі і Расіі;

◆ камерцыйную інфармацыю абанентаў сеткі, афармляемую ў выглядзе: тавар прадаецца, купляецца, мяняецца, з гарантыяй яго наяўнасці на даны момант часу, з указаннем рэквізітаў прадаўца (пакупніка);

◆ камерцыйную інфармацыю, якая ўяўляе сабой аналіз рэкламнай інфармацыі з кантролем яе дакладнасці;

◆ аналітычную інфармацыю, якая характарызуе вынікі камерцыйных аперацый за пэўны перыяд часу (цэны на тавары, іх дынаміка і г. д.).

ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМЕРЦЫЙНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА «ГРЭТА-Ф»

вырашыць усе пытанні падключэння вашага прадпрыемства да сеткі, а таксама забеспячэння вас неабходнай інфармацыяй

(у выпадку адсутнасці ў вас IBM-сумяшчальнай ЭВМ або мадэма).

Мы не бяром пасрэдніцкія. У нас мінімальная аплата і толькі за інфармацыю.

НАШЫ РЭКВІЗІТЫ:

220056, МІНСК, ВУЛ. СПАРТЫЎНАЯ, 8 А, П. 25. ТЭЛЕФОН (0172) 69-59-22.

Галоўны рэдактар У. Б. НАРКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 32-51-05, аддзела пісьмаў—32-04-52, 32-41-92, навін—32-15-02, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

ПА НУМАРУ ДЗЯЖУРЫЛІ: намеснік рэдактара Міхаіл Міхаевіч, намеснік адказнага сакратара Яўген Ляхаў, старшы карэктар Ала Сабалеўская.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Тыраж 81.784. Індэкс 63.850. Зак. № 52. Выходзіць 250 разоў на год. Нумар падпісаны ў 21.05.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12